ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 36 (999) | Субота, 4 верасня 1954 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

Перадавы. — Рэпертуар — аснова тэатральнай творчасці.
А. Трэцякоў. — Год вялікіх здзяйсненняў.
Р. Піятухоўская. — Першыя дні.

Другая старонка.

А. Вялюгін. — Гэта не дробязі.
Б. Бур'ян. — Вобразы і цені.

Трэцяя старонка.

Ус. Краўчанка. — Малдаўскія сустрэчы.
М. Каменскі. — Без рэжысёрскага нагляду.
А. Махнач. — Родны калгас (аднаактовая п'еса).

Чацвёртая старонка.

Слова сяброў.
В. Сурмач. — У сельскім Доме культуры.
Ю. Багушэвіч. — Спартыўныя навіны.

Рэпертуар—аснова тэатральнай творчасці

Сёння ў тэатры імя Я. Купалы адкрываецца новы тэатральны сезон. Праз некалькі дзён ён пачнецца і ў астатніх тэатрах рэспублікі. Кожны наступны сезон таму і новы, што ставіць перад мастацкімі калектывамі новыя задачы і вызначае шляхі іх вырашэння.

Адной з галоўных задач з'яўляецца арганізацыя кожным тэатрам свайго рэпертуару. Якія п'есы і як будуць пастаўлены ў новым сезоне—іменна гэта будзе вызначаць, наколькі тэатральнае мастацтва спраўляецца з задачамі, пастаўленымі перад ім Комуністычнай партыяй. Між тым, многія тэатры пачынаюць свой сезон без цвёрда вызначанага рэпертуарнага плана. Не ўсе тэатры ведаюць, што яны пакажуць сваім гледачам у бліжэйшы час, бо вельмі ўжо часта планы іх пераглядаюцца і мяняюцца, што не заўсёды, між іншым, выклікаецца неабходнасцю. Чаму адбываюцца такія змены? Таму, што ў тэатрах няма перспектыўнага планавання рэпертуару. Калі нельга вызначыць на год уперад новыя п'есы совецкіх драматургаў, дык класіку планаваць можна і неабходна. Неабходна для таго, каб акцёры і рэжысёры маглі загадзя рыхтавацца да пастановак класічных п'ес, больш працаваць над увасабленнем вобразаў, што дазволіць выпускаць спектаклі на значна вышэйшым узроўні, чым выпускаліся яны да гэтага часу. Вельмі шкада, напрыклад, што такія спектаклі, як «Даходнае месца» ў тэатры імя Я. Купалы, «Грэх ды бяда на каго не жыве» ў Гродзенскім тэатры і некаторыя іншыя, пастаўленыя ў мінулым годзе, атрымаліся «прахаднымі». А яны маглі і не быць такімі, каб да пастаноўкі іх тэатры рыхтаваліся загадзя.

З нядаўняга часу за арганізацыю рэпертуару адказвае кіраўніцтва кожнага тэатра. Гэта абсалютна правільна, але ў некаторых кіраўнікоў вельмі ўжо няўстойлівыя погляды на тую ці іншую п'есу. Спачатку яна ім падабаецца і ўключаецца ў план, пасля-ж нечакана замяняецца другой і не заўсёды лепшай. У новым сезоне неабходна рэзка ўзняць ролю мастацкіх советаў, якія абмяркоўвалі-б не толькі рэпертуарны план у цэлым, але і кожную асобную п'есу, прызначаную для пастаноўкі, мелі-б сваю прынцыповую ацэнку, з якой лічыліся-б дырэктар і рэжысура.

Мастацкія советы, калі яны хочуць мець аўтарытэт у кіраўніцтва тэатра і ў калектыва, у сваёй штодзённай працы павінны абапірацца на калектыў, а не адгароджвацца ад яго, як гэта было да апошняга часу. Вядома, напрыклад, што кожны новы спектакль мастацкія советы абмяркоўваюць за зачыненымі дзвярыма дырэктарскага кабінета, без удзелу акцёраў, занятых у спектаклі. Дзіўная практыка. А чаму-б членам мастацкага совета, вопытным майстрам сцэны не выказваць сваю думку не толькі рэжысёру, а і непасрэдна самім акцёрам? Чаму ў тэатрах штучна культывіруецца баязлівасць сказаць свайму таварышу праўду ў вочы? Нічога агульнага не мае падобная «страусавая» палітыка з сапраўднай барацьбой за чысціню і высокую якасць совецкага мастацтва.

У гэтым сезоне, як ніколі, спатрэбяцца сур'ёзныя намаганні кіраўніцтва тэатраў, мастацкіх советаў і ўсіх творчых калектываў у ажыццяўленні рэпертуарнай лініі. Тэатры маюць мала совецкіх п'ес. У многіх драматургаў залішне ўжо зацягнулася творчая пауза, і яны нічога новага не напісалі за апошні час. Некаторыя-ж тэатры пайшлі па лініі найменшага супраціўлення. План пастановак совецкіх п'ес у другім поўгоддзі яны знізілі да мінімуму. Так, тэатр імя Я. Купалы не выпусціць у бліжэйшы час ніводнага спектакля па совецкай п'есе. Тэатр імя ЛКСМБ з совецкіх п'ес вызначыў адну — «Гісторыя аднаго кахання» К. Сіманава. Абласныя тэатры — Гродзенскі і Магілёўскі — запланавалі па дзве совецкія п'есы, пастаноўка адной з якіх («Чужое дзіця») у Гродзенскім тэатры, між іншым, не апраўдана ніякімі меркаваннямі, акрамя касавых.

Аб становішчы з тэатральным рэпертуарам павінна быць размова і на трэцім з'ездзе пісьменнікаў Беларусі. Нельга абмежавацца толькі канстатацыяй адставання беларускай драматургіі. Трэба глыбока прааналізаваць прычыны такога адставання, высветліць, чаму ў рэпертуарных планах тэатраў у новым сезоне няма п'ес беларускіх драматургаў. Вельмі добра, што тэатр імя Я. Купалы рыхтуе праграму з класічных беларускіх вадэвіляў, а тэатр імя Я. Коласа плануе пастаноўку ў «Пушчах Палесся» Я. Коласа. Але дзе-ж сучасная п'еса, якая з'яўляецца асновай творчага жыцця тэатра?

Разам з тым, нашы калектывы павінны больш увагі аддаць спадчыне. Чаму, напрыклад, не паставіць на беларускай сцэне некаторыя п'есы А. Афінагенава і многія іншыя незаслужана забытыя п'есы?

Маскоўскі Цэнтральны тэатр транспарту, які гасцюе цяпер у нашай сталіцы, упершыню паставіў на сцэне спектаклі «Хаджэнне па пакутах», «Да новага берага», «Крадзеж», «Маці сваіх дзяцей» і іншыя.

Чаму-б і нашым некаторым тэатрам не пераняць падобную практыку і не зрабіць інсцэніроўкі па асобных раманах, аповесцях, паэмах беларускіх пісьменнікаў? Хоць інсцэніроўка і не можа замяніць п'есу, але і яна мае законнае права на існаванне ў рэпертуары. Між тым беларускія тэатры не маюць ніякага вопыту стварэння інсцэніровак і чамусьці не імкнуцца яго набываць. Інсцэніроўка-ж лепшых твораў беларускай літаратуры дапамагла-б тэатрам значна ўзбагаціць рэпертуар.

У свой час у друку адзначалася, што акцёры беларускіх тэатраў слаба валодаюць мовай. Такое становішча наглядаецца і па сённяшні дзень. Са сцэны тэатраў імя Янкі Купалы і Якуба Коласа часта гучаць знявечаныя словы, якія нельга назваць ні беларускімі, ні рускімі. Яшчэ горш, калі такое вымаўленне слухаюць рускія і украінскія гледачы ў час гастролей нашых тэатраў. У Беларусь часта прыязджаюць рускія і украінскія тэатры. Хто не захапляўся на іх спектаклях бездакорным вымаўленнем рускіх ці украінскіх акцёраў? І было-б дзіўна пачуць у іх які-небудзь непісьменны словатвор. У нашых-жа тэатрах — гэта звычайная з'ява, на якую, акрамя гледачоў, ніхто не звяртае ўвагі. Моўная неахайнасць у беларускіх акцёраў яшчэ больш становіцца недаравальнай, калі яе нясуць у мільённыя масы гледачоў дубліраваныя на беларускую мову фільмы. Праўда, пры дубляжы за мовай акцёраў калі-ні-калі сочыць кансультант; у тэатры-ж ніхто і ніколі не цікавіцца сцэнічнай мовай, і кожны акцёр гаворыць, як умее. Гэтаму часта спрыяюць яшчэ механічныя пераклады многіх п'ес з рускай на беларускую мову.

Рэпертуар, майстэрства акцёраў і рэжысёраў, правільная сцэнічная мова — пытанні, якія набываюць цяпер асаблівае значэнне ў сувязі з тым, што аудыторыя тэатральных гледачоў непамерна пашырылася. Тэатры, як правіла, выязджаюць са спектаклямі ў раённыя цэнтры, у калгасы, у рабочыя клубы. Цікавасць да тэатральнага мастацтва непамерна ўзрасла. Трэба думаць, што ў новым сезоне нашы тэатры яшчэ часцей будуць наведваць раённыя і сельскія клубы і яшчэ больш актыўна будуць дапамагаць справе культурнага росту калгаснай вёскі. І вельмі шкада, між іншым, што адзіны калектыў — Тэатр драмы і камедыі, які абслугоўвае выключна раённыя цэнтры і калгасы, не карыстаецца належнай увагай Галоўнага ўпраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР. Трэба, нарэшце, паклапаціцца, каб гэты тэатр меў сваю базу, неабходны транспарт, рэквізіт і г. д.

Тэатрам трэба дапамагаць, але неабходна і патрабаваць ад іх яшчэ большай настойлівасці ў павышэнні якасці спектакляў, непрымірымасці да іх недахопаў, заўсёды маючы на ўвазе спагадлівага, але патрабавальнага совецкага гледача.

Год вялікіх здзяйсненняў

Далёка ззаду засталіся Мінск, Слуцк, Баранавічы. На гарызонце паказаўся новы горад — Ваўкавыск. Імжыла. Ледзь бачны былі дамы, заводскія коміны, дрэвы.

Вось і Ваўкавыская МТС. Сядзіба яе ўся абсаджана дрэвамі. Падзьме вецер, і са шматлікіх галін падаюць празрыстыя кроплі.

Чалавек, які стаяў блізка ля дрэў, не звяртаў ніякай увагі на тое, што пры кожным новым парыве ветру на яго ліўся дождж. Ён спакойна аддаваў апошнія распараджэнні:

— Нічога! Ну які гэта дождж... Толькі крыху накрапвае. Усе жняяркі павінны працаваць, разумееце — усе! Самі за гэтым прасачыце.

Лёгка было здагадацца, што гэты чалавек — дырэктар МТС. Мы спыталі ў яго: «Што новага ў вас, што добрага?».

Калі прыняць пад увагу тое, што дробны надакучлівы дождж ні на хвіліну не пераставаў, дык добрага, вядома, было мала. Але Васіль Герасімавіч Зубкоў, так называлі дырэктара, не задумваючыся адказаў:

— І добрага многа, і навіны ёсць.

— Якія навіны?

— Пра навіны звычайна расказваюць, а я хачу паказаць вам новае. Так будзе лепш. Згодны?

Не чакаючы адказу, ён крыкнуў:

— Міша, заводзь!

Шафёр уключыў стартёр, а Зубкоў, высокі і поўны чалавек, надзіва спрытна залез у машыну. «Газік» выехаў на дарогу. Бясконцай чарадой паплылі палі. На іх увесь ураджай быў зняты. Людзі дарэмна не гублялі час. Нават такая сур'ёзная перашкода, як дождж, не магла спыніць палявыя работы.

Мінулі вёску. «Газік» спыніўся. Зубкоў выйшаў з машыны. І ў словах яго мы адчулі радасць, калі ён, працягнуўшы руку наперад, сказаў:

— А вось — і наша навіна! Глядзіце самі.

Нас сустрэў гул трактараў, шум транспарцёраў, крыкі людзей. Зубкоў хутка апынуўся ў цэнтры падзей. Ён пераходзіў ад аднаго агрэгата да другога, на хаду вітаўся з людзьмі, пасмейваўся, кідаў рэплікі. І здавалася, што з яго прыездам усё тут стала адбывацца яшчэ больш імкліва. Хутчэй замільгалі постаці людзей, больш спрытна запрацавалі іх рукі. Кіпела гарачая дружная праца.

Мы былі на калгасным таку сельгасарцелі імя Карла Маркса, на тым самым таку, дзе ўсяго толькі год назад дзяўчаты круцілі дзве старыя веялкі. Мы былі на тым самым месцы, дзе яшчэ зусім нядаўна селянін усходніх «крэсаў» выбіваў зерне з невялікіх худых снапоў дапатопнымі цапамі.

Дождж не спыніў работу. Людзі надзейна абараніліся ад непагоды вялікімі павецямі. На нашых вачах адбылося цікавае пераўтварэнне. На пляцоўцы ўзвышалася гара збожжа. Дождж змачыў яго. Але чалавек перамог непагадзь. Спачатку зерне паступала ў магутную ачышчальную машыну, пасля яно няспынным патокам ішло па транспарцёру ў сушылку, якая за гадзіну паглынала дзве тоны вільготнага збожжа і тут-жа выдавала яго сухім. Потым збожжа яшчэ раз паступала на сартыроўку. Адсюль яго забіралі аўтамашыны, кузавы якіх пакрываліся брызентам.

Дзіўныя рэчы адбываліся на нашых вачах! Дождж ішоў, а збожжа няспынным патокам людзі адвозілі на элеватары. Зубкоў паведаміў нам, што механізаваны ток, пабудаваны калгаснікамі і работнікамі МТС, абслугоўвае шэсць сельгасарцелей і дае магчымасць сэканоміць звыш 30 тысяч працадзён.

— А яшчэ навіны ёсць? — звярнуліся мы да дырэктара.

Ён усміхнуўся.

— Уявіце сабе, што ёсць. І нямала. Вось, калі ласка. Атрымалі 17 новых камбайнаў, ільноцерабілкі, трактары, бульбаўборачныя камбайны. Узброіліся, як належыць.

Уся тэхніка, атрыманая ад дзяржавы, механізатарамі выкарыстоўваецца ўмела. У зоне МТС вырашчаны ўраджай у паўтара разы большы, чым у мінулым годзе, і ўборка яго, нягледзячы на дрэннае надвор'е, праходзіла ў добрым тэмпе.

Мы праехалі не адну сотню кіламетраў. Бачылі, як зладжана працуюць камбайны, малатарні і ільноцерабілкі, стагакіды. А на палях зоны Пружанскай МТС давялося ўбачыць зусім іншае.

Яшчэ жаўцелі квадраты аўсу, сцяной стаяла бурая грэчка, зелянеў багаты бульбянік, а па вялікаму папараваму полю ішоў трактар, які цягнуў нейкі незвычайны плуг.

Наша машына спынілася. Да нас ішоў чалавек вышэй сярэдняга росту ў гімнасцёрцы ваеннага пакрою. Увесь ён быў падцягнуты, дакладны ў кожным руху. Гэта быў галоўны аграном Пружанскай МТС Міхаіл Трыфанаў.

— Без адвалаў арэце?

— Як бачыце...

— Гэта-ж пярэчыць правілам агратэхнікі.

— І Тэрэнцію Мальцаву гаварылі тое-ж самае. А ён атрымаў сёлета 150 пудоў пшаніцы з гектара!

Трыфанаў весела засмяяўся, і ўвесь выраз яго твару, здавалася, гаварыў: «Ну, а што цяпер скажаце?».

Нібы нябачныя ніці працягнуліся ад уральскага калгаса «Запаветы Леніна» да беларускай сельскагаспадарчай арцелі імя Молатава. Выдатнае вынаходніцтва калгаснага вучонага Тэрэнція Мальцава знайшло прымяненне на беларускай зямлі.

— Як вы мяркуеце — удалым будзе ваш вопыт? — спыталі мы ў Трыфанава.

— Для таго, каб даць на гэтае пытанне дакладны адказ, неабходна гадок пачакаць. Але дрэнны той вопытнік, хто ва ўсім сумняваецца. Я асабіста веру ў поспех... Калгас наш з'яўляецца вялікай вытворчай лабараторыяй, на яго палях ставяцца дзесяткі рознастайных доследаў. Наш абавязак — настойліва, паслядоўна шукаць новыя шляхі ў земляробчай навуцы...

Галоўны аграном параіў нам наведаць суседні калгас «Перамога» і абавязкова пазнаёміцца, як працуе ільноцерабільшчыца Яўгенія Окрут. Па дарозе ў гэтую арцель мы сустрэліся з цікавымі фактамі.

... Быў цудоўны ранак. На небе ні воблачка. Работа на таку пачалася рана. Усё ішло добра так да гадзін дзесяці. Раптам з усходу стала хутка насоўвацца велізарная свінцовая хмара. Застагнаў, засвістаў калючы вецер. Бліснула маланка. На таку было тон 50—60 збожжа. Але калгаснікі захоўвалі спакой. Як толькі на зямлю ўпалі першыя кроплі дажджу, над пляцоўкай, дзе ляжала збожжа, з'явіўся своеасаблівы навес. Праз гадзіну дождж перастаў. Навес над пляцоўкай быў зняты, і праца на таку распачалася зноў.

Мы пазнаёміліся з аўтарамі праекта перасоўнага тока — цесляром Аляксеем Вялікасельцам і намеснікам старшыні калгаса Аляксеем Зелянякам, які трапна заўважыў:

— Быў у нас яшчэ адзін сааўтар— дрэннае надвор'е. Яно таксама з'яўляецца стваральнікам перасоўнага тока.

Але што-ж гэта за ток? У кожнай паляводчай брыгадзе лёгка падабраць пляцоўку памерам у 150 квадратных метраў. Пераходзяць камбайны з адной паляводчай брыгады ў другую, і за імі крочыць і перасоўны ток. Акрамя звычайных зерне-ачышчальных машын, у яго складзе—навес на калёсах. Пайшоў дождж — навес вышынёю ў пару метраў накатваецца на пляцоўку, скончыўся дождж — навес здымаецца. І проста і зручна. Збожжа заўсёды сухое.

У сённяшняй калгаснай вёсцы з рацыяналізатарскай думкай сустракаемся на кожным кроку. Ільноцерабільшчыца Яўгенія Окрут удасканаліла сваю машыну. Цяпер галоўнае кола ільноцерабілкі не буксуе. На машыне стала значна лягчэй працаваць.

У дарозе мы даведаліся, што закончана першае, з дзесяткаў распачатых у рэспубліцы, будаўніцтва Рагазнянскай МТС. Упершыню мы ўбачылі, як выглядае тыповая МТС не ў малюнках архітэктара, а ў жыцці. Сённяшняя Рагазнянская МТС — гэта вялікі гарадок, дзе ёсць зручныя жылыя дамы, вялікі інтэрнат, сталовая, лазня, кантора, магазін, уласнае водазабеспячэнне, электрастанцыя, майстэрня, добра абсталяваная навейшымі механізмамі, нафтабаза з лабараторыяй. Усё гэта пабудавана трывала, прыгожа і зручна. Гэты новы індустрыяльны фарпост калгаснай вёскі ўзнік за якіх-небудзь восем месяцаў. Дзяржава адпусціла на будаўніцтва МТС больш трох мільёнаў рублёў. Механізатарам створаны ўсе ўмовы, каб узнімаць нашу сельскую гаспадарку на новую ступень прагрэсу.

Вось і знаёмыя палі перадавога калгаса «Зара комунізма». На беразе невялікага ручая чуваць смех, громкія галасы. Дзяўчаты рассцілаюць лён. Рухавая і спрытная звеннявая Марыя Лазука з гонарам гаворыць:

— Бачыце, які наш лянок.

— Што, ужо абмалацілі?

— Даўно. Па 35 пудоў насення атрымалі з кожнага гектара.

— А наша Марыя Лазука, — сказаў нехта з дзяўчат, — ордэн Леніна атрымала за лён. І яшчэ 32 калгаснікі атрымалі ўрадавыя ўзнагароды.

— Цяпер у нас няма адстаючых звеняў.

— Зарабілі сёлета не горш інжынераў. Кожная звеннявая атрымае тысяч 25, — наперабой расказвалі ільнаводкі. — У наступным годзе ўсе на выстаўку ў Маскву паедзем. Заслужылі ўсё сваёй працай.

У Любчы сакратар райкома партыі тав. Жалезняковіч расказаў нам прыемныя навіны: сярэдні ўраджай збожжавых па раёну ў паўтара разы вышэй за мінулагодні, а ўраджай ільну — амаль у два разы. Ёсць усе падставы разлічваць, што любчанскія калгасы, дзякуючы перадавой агратэхніцы і добрасумленнай працы механізатараў атрымаюць прыбытак ад ільну прыкладна 60—70 мільёнаў рублёў.

Сустрэчы ў калгасах і МТС пакінулі незабыўнае ўражанне. Новае трывала ўваходзіць у калгасную вытворчасць. Паспяхова ажыццяўляецца велічная праграма нашай партыі. Прайшоў толькі год з таго часу, як вераснёўскі Пленум ЦК КПСС прыняў сваё гістарычнае рашэнне, а як далёка наперад пакрочыла калгасная вёска, як узнялася культура сацыялістычнага земляробства! Мы ведаем, што наперадзе яшчэ многа спраў, не ўсюды яшчэ выкарыстаны невычэрпныя рэзервы калгаснага ладу. І ўсё-ж пражыты год можна назваць годам вялікіх пераўтварэнняў у нашай сельскай гаспадарцы.

А. ТРЭЦЯКОЎ.

Гродна — Брэст.

Памяці П. Труса

29 жніўня каля клуба калгаса «Чырвоны Кастрычнік» было людна. Ушанаваць памяць свайго земляка, выдатнага паэта П. Труса сабраліся калгаснікі з вёсак Нізок, Прысынак, Астравок і Падцацкія. Сюды прыбылі таксама паэты, якія асабіста ведалі П. Труса, і настаўнікі з раённага цэнтра. Сярод прысутных — калгаснікі Андрэй Трус, Фёдар Несцюк, Алесь Атраховіч, сябры паэта.

Сакратар Уздзенскага раённага камітэта Комуністычнай партыі т. Дзернушкоў Ф. І. прадастаўляе слова Алесю Якімовічу. Пісьменнік расказвае прысутным аб сваіх сустрэчах і аб дружбе з паэтам-комсамольцам.

Вельмі цёпла і сардэчна сустрэлі калгаснікі свайго слаўнага земляка, лаўрэата Сталінскай прэміі, пісьменніка Кандрата Крапіву.

Ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным 25-годдзю з дня смерці П. Труса, прынялі ўдзел беларускія паэты Пятро Глебка, Адам Русак, Анатоль Астрэйка. Яны расказалі прысутным аб сустрэчах з паэтам і прачыталі калгаснікам свае вершы.

Вучаніца Нізаўской школы Тамара Кучук прачытала на сходзе паэму П. Труса «Астрожнік».

* * *

Раённая Уздзенская дзіцячая бібліятэка 27 жніўня правяла вечар памяці паэта. Аб жыцці і творчай дзейнасці Паўлюка Труса зрабіў даклад выкладчык мовы і літаратуры сярэдняй школы імя Пушкіна Іван Шаблюк. Настаўнік беларускай сярэдняй школы Іван Трус падзяліўся з чытачамі бібліятэкі сваімі ўспамінамі аб сумеснай вучобе і аб дзіцячых і юнацкіх гадах паэта.

* * *

29 жніўня адбыўся ў раённым цэнтры Узда вялікі літаратурны вечар памяці Паўлюка Труса. З успамінамі аб Паўлюку Трусу і з чыткай сваіх твораў выступілі беларускія пісьменнікі К. Крапіва, П. Глебка, А. Якімовіч і А. Русак.

* * *

2-га верасня група пісьменнікаў на чале са старшынёй праўлення ССП БССР П. Броўкам усклала вянок на магілу паэта.

Новая школа

У самым жывапісным месцы соўгаса «10-годдзе БССР» Любанскага раёна, на беразе штучнага возера, сярод векавых сосен і дубоў узвышаецца двухпавярховы будынак новай сярэдняй школы. Цудоўны падарунак атрымалі дзеці рабочых і служачых соўгаса ў новым навучальным годзе. Да іх паслуг — светлыя прасторныя класы, добра абсталяваныя кабінеты фізікі і хіміі.

А. ВЕРАМЕЙЧЫК.

Цікавыя знаходкі

Многія выхаванцы Клецкага дзіцячага дома № 1 — члены гуртка па вывучэнню роднага краю. За лета яны правялі многа паходаў, гістарычных раскопак. Многа цікавых гістарычных рэчаў знайшлі дзеці ў час сваіх падарожжаў па роднаму краю. Сярод іх: два сярэбраныя пярсцёнкі рускіх воінаў часоў XIII стагоддзя, медныя манеты XVI і XVII стагоддзяў, каменную сякеру перыяду каменнага веку і інш. Выхаванцы дома зрабілі выстаўку знойдзеных рэчаў.

Ул. ДЗІКЕВІЧ.

Літаратурны вечар у Брэсце

У Брэсцкім тэатры імя Ленінскага комсамола Беларусі 31 жніўня г. г. адбыўся агульнагарадскі літаратурны вечар моладзі, прысвечаны III з'езду совецкіх пісьменнікаў БССР і сустрэчы з абаронцамі Брэсцкай крэпасці.

Вечар адкрыў сакратар абкома комсамола В. Самовіч. Даклад аб дасягненнях беларускай совецкай літаратуры зрабіла кандыдат філалагічных навук А. Крайко.

Маскоўскі пісьменнік С. Смірноў падзяліўся планамі сваёй работы над гістарычным нарысам пра абарону Брэсцкай крэпасці.

З вялікай цікавасцю моладзь праслухала ўспаміны абаронцаў Брэсцкай крэпасці — былога сакратара комсамольскага бюро аднаго з палкоў, якія абаранялі крэпасць, С. Матэвасьяна і былога камандзіра ўзвода лейтэнанта А. Махнача, студэнта літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага.

У вечары прынялі ўдзел члены Брэсцкага літаратурнага аб'яднання М. Засім, Ул. Кулакоў, А. Авечкін.

На вечары прысутнічала больш за 1.000 чалавек.

М. АРЦЕМАЎ.

Паведамленне

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР паведамляе, што адкрыццё III з'езда адбудзецца 15 верасня, у 2 гадзіны дня, у памяшканні Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы.

Першыя дні

Прайшло ўжо тры дні новага школьнага года. Гэтыя першыя дні заўсёды хвалюючыя як для школьнікаў, так і для настаўнікаў. Але сёлета падрыхтоўка да заняткаў была асабліва стараннай. Пастанова XIX з'езда партыі аб увядзенні політэхнічнага навучання ў школах выклікала да жыцця даўно чаканы перагляд старых вучэбных планаў. Школы цяпер атрымалі новыя праграмы і падручнікі. Новыя праграмы намнога аблегчаць працу педагога, ліквідуюць перагрузку школьнікаў вучэбнымі заняткамі, дапамогуць арганізаваць навучальны працэс так, каб школа стала сапраўды політэхнічнай, г. зн., каб яна не толькі забяспечвала трывалыя веды асноў навук, але і знаёміла вучняў з асновамі вытворчасці, выхоўвала-б навыкі, уменне, патрэбныя ў іх будучай практычнай дзейнасці.

З гэтай мэтай павялічваецца колькасць гадзін па фізіцы і хіміі. Некаторыя другарадныя тэмы з праграмы выключаюцца. Гэта дасць магчымасць значна павысіць узровень ведаў вучняў. У новых падручніках прадугледжваецца значная колькасць лабараторных работ, розных практычных заданняў, якія маюць на мэце навучыць вучняў самастойна ставіць той ці іншы дослед.

У новых праграмах аддаецца больш увагі фізічнаму і эстэтычнаму выхаванню вучняў.

Каб у новым навучальным годзе прыступіць да працы па новых праграмах, педагагічным калектывам школ неабходна было старанна прадумаць, як перабудаваць работу. У 4-й мінскай сярэдняй школе да гэтай сур'ёзнай перабудовы рыхтаваліся ўсё лета. Не так проста ажыццявіць увядзенне ручной працы ў 1 — 4 класах і працы ў майстэрнях і на прышкольным участку ў 5 — 7 класах. Неабходна-ж падрыхтаваць памяшканне, абсталяваць майстэрні, пашырыць, калі магчыма, прышкольны ўчастак.

На дапамогу школе прыйшлі шэфы — завод імя Кірава і педагагічны інстытут імя Горкага. Цяпер у рабочым пакоі юных майстроў чакаюць варштаты, напільнікі, ціскі для заняткаў па слясарнай справе. Больш складаным аказалася пытанне з арганізацыяй практыкумаў па машыназнаўству і электратэхніцы для вучняў старэйшых класаў. Прыйшлося звярнуцца ў Політэхнічны інстытут. Яго кабінеты і лабараторыі будуць прадастаўлены школьнікам у дні практыкумаў.

Не раз пабываюць вучні на экскурсіях і ў іншых інстытутах сталіцы. Яны наведаюць, напрыклад, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, які адкрыўся ў гэтым годзе. У склад вучэбнага плана ўключаны таксама экскурсіі на фабрыкі і заводы. Усё гэта не толькі будзе садзейнічаць замацаванню ведаў па фізіцы, хіміі і матэматыцы, але і дапаможа школьнікам у выбары прафесіі.

Мы пабывалі ў 4-й мінскай школе. 1-га верасня не без хвалявання займалі свае месцы дзяжурныя комсамольцы. Па-святочнаму апранутыя, падцягнутыя, злёгку чырванеючы, імкнучыся схаваць збянтэжанасць, юнакі радасна віталі новых таварышаў, паказвалі ім класы, піонерскі пакой, расказвалі аб сваёй школе. І міжволі адзначалі ў думках, што сёння іх школа набыла па-асабліваму святочны выгляд, стала прыгажэйшай. Магчыма гэта таму, што цяпер у школе мільгацелі белыя парадныя фартушкі дзяўчынак, іх яркачырвоныя, блакітныя, сінія істужкі.

— Ну як, падабаецца табе наша школа? — пытаецца дзесяцікласнік у дзяўчынкі з тоўстымі светлымі косамі.

— Вядома, падабаецца, — адказвае тая, уважліва, па-гаспадарску агледаючы новую школу. — І асабліва добра тое, што я вучыцца буду ў адной школе з братам. Ён яшчэ маленькі, ходзіць у другі клас. Вось я і змагу цяпер лепш даглядаць яго. А яшчэ добра тое, што самадзейнасць у нас цяпер будзе значна цікавейшая. У мінулым годзе ў нас часта былі няўдачы. Задумаем, напрыклад, паставіць у драмгуртку п'есу, а мужчынскія ролі няма каму выконваць. Вось і даводзілася або хлопчыкаў з суседняй школы запрашаць, або самім пераапранацца ў мужчынскія касцюмы.

Дзесяцікласнік згаджаецца са сваёй субяседніцай і запэўняе яе, што ў гэтым годзе такіх выпадкаў больш не здарыцца. Захочам — паставім нават і «Рэвізора»!

Так незаўважна, яшчэ да пачатку заняткаў, завязваліся знаёмствы. І няхай дружба ўзнікне пазней, у дні настойлівай вучобы і працы, але першыя дні, праведзеныя ў новай школе, у новым калектыве, паклалі пачатак таварыскім адносінам.

У школе створаны ўсе ўмовы для таго, каб выканаць ганаровую задачу, пастаўленую перад педагогамі — выхаваць у вучняў любоў да працы, уменне працаваць, паважаць людзей працы.

Р. ПІЯТУХОЎСКАЯ.

ДА ТРЭЦЯГА З'ЕЗДА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Гэта не дробязі

Анатоль ВЯЛЮГІН

Кожны літаратар пільна сочыць за перад'здаўскай дыскусіяй. Чытаючы выступленні старэйшых і малодшых таварышаў, уважліва праглядваючы цэлыя газетныя палосы і падборкі пісем чытачоў, адчуваеш, як па-гаспадарску, клапатліва ставіцца совецкі народ да сваёй літаратуры.

На трыбуне, дзе будзе падагульняцца вопыт усёй работы сучасных пісьменнікаў, мы павінны шчыра, без аглядкі на рангі, сказаць аб заганах у нашай творчасці. Творчыя пытанні — першачарговыя пытанні, якія павінен вырашыць з'езд.

Я хачу спыніцца на некаторых арганізацыйных метадах работы ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР.

Колькі ў нас вялося і вядзецца гаворак аб творчых секцыях. Секцыі-ж па-ранейшаму працуюць кепска, хаця кожны год у час справаздачы і перавыбараў бюро заўсёды пры ацэнцы іх работы дыпламатычна ставіцца адзнака «здавальняюча». У чым справа? Думаю, што пры адказе на гэта пытанне можа дапамагчы арыфметыка. Калі ўзяць колькасць усіх членаў нашай арганізацыі, якія актыўна працуюць у літаратуры, і падзяліць гэты лік на колькасць секцый, дык атрымаецца, што кожная секцыя аб'едноўвае толькі 8—10 чалавек. Прычым, старэйшыя, вопытныя таварышы на пасяджэнні звычайна не з'яўляюцца, а калі і прыходзіць хто, дык адразу-ж спяшаецца па сваіх кіраўнічых справах, а іншы, абыякавы да ўсяго, у час пасяджэння іграе ў шахматы (я маю на ўвазе «сваю», паэтычную секцыю). Можа старэйшых таварышаў не цікавіць секцыйная работа? Не. Калі на пасяджэнні ставіцца сапраўды творчае, надзённае пытанне, — збіраецца многа паэтаў, прысутнічаюць вопытныя майстры, вядзецца цікавая, змястоўная гаворка. Але такое свята рэдка бывае. У буднія дні на пасяджэннях сумна, прысутнічае чалавек пяць, пытанне — дробязнае, і вырашаецца яно келейна, непрынцыпова. Патрэбна новаму твору маладога аўтара рэкамендацыя Саюза пісьменнікаў для выдавецтва — збіраецца секцыя. Згубіў чыйсьці Пегас кволыя капыты на крытычных каменьчыках — для абароны збіраецца секцыя.

Нядаўна ў Саюз пісьменнікаў на нараду з'явіўся пачынаючы песеннік, аўтар ста тэкстаў, А. Дзеружынскі. Ён меўся паставіць сваю «сталогію» разам з падрыхтаванай заявай аб уступленні ў члены Саюза на абмеркаванне паэтычнай секцыі. Паэты шчыра і адкрыта пачалі гаварыць аб заганах яго вершаў. А. Дзеружынскі порстка запярэчыў:

— Вы мне не дапаможаце, я пайду ў другую секцыю...

І сапраўды, была ўжо дамоўленасць з бюро секцыі сатыры і гумару, што яна будзе разглядаць тэксты песень Дзеружынскага.

Гумар сумны. Сведчыць ён аб значных непаладках у рабоце творчых секцый.

Чаму, напрыклад, не абмеркаваць новую кнігу таленавітага байкапісца Ул. Корбана на аб'еднаным пасяджэнні, дзе паэты і сатырыкі маглі-б пагаварыць аб сучаснай байцы, аб яе моўнай фактуры, вобразах? Ул. Корбан чытае новыя байкі чамусьці толькі ў вузкім коле малодшых калег-гумарыстаў.

У апошні час адбыліся сумесныя пасяджэнні секцый. Паэты, перакладчыкі і члены секцыі дзіцячай літаратуры цікава і змястоўна абмяркоўвалі працу Я. Семяжонава — пераклад кнігі Джані Радары «Неапаль без сонца».

Практыка паказвае, што нашы секцыі трэба ўзбуйніць. На маю думку, павінны рэгулярна працаваць у нас асноўныя секцыі — прозы, паэзіі і драматургіі.

Я не ведаю, калі і якія сёлета кардынальныя акадэмічныя праблемы вырашала камісія па крытыцы. Ведаю толькі, што ніводзін крытык, апрача А. Кучара, не прымае ўдзелу ў рабоце творчых секцый.

Невыпадкова ў перад'здаўскай дыскусіі гэтак дастаецца крытычнаму фронту. У нас яшчэ цяжка знайсці крытыка з уласным творчым абліччам, са сваім стылем. Крытык, як трапна вызначыў Пётр Паўленка,—гэта «інспектар па якасці», упаўнаважаны грамадства, які ад імя грамадства прымае мастацкую прадукцыю. І кепска бывае тады, калі гэты «інспектар па якасці» не мае тых якасцей, якія абавязкова павінен мець кожны чэсны чалавек. Як чытач не паверыць пісьменніку-лакіроўшчыку, гэтак ён не паверыць і крытыку, які не ведае праўды жыцця. Прыгадваецца цяжкое пасляваеннае лета. Мала было тэхнікі на нашай спаленай, здратаванай зямлі. А. Бялевіч напісаў тады «Жніўную песню». Крытычна ўзброены таварыш ушчэнт разбіў верш за тое, што паэт нібыта «паэтызуе серп». Артыкул быў змешчаны на другой паласе газеты, а на першай — усе чыталі інфармацыі аб лепшых жнеях рэспублікі і бачылі партрэты перадавых калгасніц.

Літаратуры непатрэбны і «крытычныя флюгеры». Усе мы прыязна ставімся да работы здольнага маладога таварыша Б. Бур'яна. Але прыкра назіраць, як часта ён мяняе свае думкі пры ацэнцы шмат якіх з'яў сучаснай беларускай паэзіі. Некалькі год таму назад ён абвінавачваў амаль кожнага паэта за лірычныя і прыродаапісальныя вершы, рытарычныя-ж вершы гэтых паэтаў ён узнімаў тады на шчыт. Цяпер Б. Бур'ян крытыкуе апошнія. Дастаткова перагледзець яго артыкулы, змешчаныя ў газетах «Сталинская молодежь» і «Літаратура і мастацтва», каб упэўніцца ў гэтым. Б. Бур'яну, як і кожнаму сапраўднаму крытыку, у размовах з паэтамі трэба пазбыцца нігілістычнага крыку і танных барадатых жартаў, накшталт «адрэдагаванай сасны», і сур'ёзна вывучаць жыццё, мову, культуру і побыт народа, аб літаратуры якога ён выказвае сваю думку.

Пры Саюзе пісьменнікаў існуе бюро прапаганды літаратуры. Не памылюся, калі скажу, што ніхто з нас сёння не помніць прозвішчаў ні старшыні, ні членаў гэтага бюро. Выступленні-ж паэтаў і празаікаў, іх сустрэчы з чытачамі праводзяцца без плана. У выступленнях заўсёды ўдзельнічае толькі 12—15 членаў Саюза, у большасці — паэты. Бывае, кожнаму з іх даводзіцца выступаць узапар па 10 рабочых дзён у месяц. Пры выездзе ў вобласці ім «даводзіцца план»— рабіць дзве-тры сустрэчы штодзённа. За любое эстраднае выступленне акцёры атрымоўваюць ганарар. У нас-жа выступленні не аплачваюцца, хаця па статуту Цэнтральнага бюро прапаганды літаратуры ССП СССР яны павінны аплачвацца.

Мы не шануем рабочы час пісьменніка. Аднойчы з творчага адпачынку адклікалі ў Мінск паэта Зарыцкага, каб той выступіў у дні «чарговага мерапрыемства» перад служачымі прамысловай арцелі. У вызначаны час паэт прыйшоў у арцель, аднак сустрэчы так і не адбылося, бо з'явілася ўсяго... чатыры бабулькі з унукамі. Вялікая пачэсная справа прапаганды совецкай літаратуры ў нас часам разглядаецца, як «чарговае мерапрыемства». Адсутнічае план пісьменніцкіх выступленняў, часта пісьменнікі адрываюцца ад працы, калі патрэбы ў гэтым няма.

Такая пісьменніцкая арганізацыя, як мінская, павінна, нарэшце, мець свой Дом літаратара, дзе можна было-б сустрэцца з таварышамі па прафесіі. Рэдакцыі часопісаў «Полымя» і «Беларусь», альманаха «Советская Отчизна» да гэтага часу лічацца пасынкамі выдавецтва, займаючы тры невялічкія пакойчыкі, дзе нехапае крэслаў нават для супрацоўнікаў.

Дарэчы, аб выдавецтве. У яго рабоце няма аператыўнасці. Новую кнігу трэба абавязкова здаваць да першага чэрвеня бягучага года з тым разлікам, каб яна, увайшоўшы ў план рэдакцыйнай падрыхтоўкі, змагла ўбачыць свет у наступным годзе. Згодна такіх законаў, для прыкладу, кніжку надзённых нарысаў В. Овечкіна, якія напісаны летась у жніўні-верасні, наша выдавецтва змагло-б даць чытачу толькі ў 1955 годзе. Тэмпы для выдання многатомнай класікі! Выдавецтва павінна аператыўна заказваць пісьменнікам творы на найбольш актуальныя тэмы і хутка іх выдаваць. Маякоўскі гаварыў аб «дажджы брашур», аб кніжцы, якая, увечары заняўшы зыходны рубеж на рабочым стале паэта, праз дзень павінна заняць месца ў арсенале народа.

Выдавецтва чамусьці паважае пухлыя выданні. Яно не прымае да друку зборнік, у змесце якога пятнаццаць надзённых добрых вершаў. Абавязкова давай аднатомнік. А трэба помніць добрыя традыцыі: у першых зборніках Н. Тіханава «Брага» і «Арда» было ўсяго па дзесятку вершаў, якія ўвайшлі ў гісторыю совецкай літаратуры; не больш вершаў і ў «Індыйскай баладзе» Мірзо Турсун-задэ. Сапраўдным вершам семафор трэба адкрываць адразу!

Варта падумаць аб выданні асобнай літаратурнай газеты, якая-б шырока асвятляла пытанні літаратуры і была-б добрым дарадчыкам пісьменніка і чулым настаўнікам моладзі.

Ёсць у нас і такі інстытут, як праўленне рэспубліканскага аддзялення Літфонда СССР. Выбіраюцца ў праўленне пісьменнікі. Заклікана яно кантраляваць дзейнасць Літфонда, дбаць аб надзённых патрэбах кожнага пісьменніка, які самааддана і паспяхова працуе ў літаратуры. Не скажаш гэтага пра наша праўленне Літфонда. Тут усё залежыць ад сімпатый дырэктара, у дзейнасці якога заўважаюцца дзве крайнасці: ён дбае або аб вышэйшых па рангу, або аб тых «мёртвых душах» у Саюзе пісьменнікаў, якія «во время оно» выдалі адну-дзве забытыя кніжкі і цяпер маўчаць. Мы, напрыклад, за трынаццаць год не прачыталі ніводнага новага твора У. Фінкеля, але ён адзін з першых атрымаў кватэру і неўзабаве пасля наваселля — чатыры тысячы рублёў на рамонт...

Бачу я, некаторыя таварышы ўсміхаюцца: пра дробязі, братка, гаворыш... А я спадзяюся, што побач з першачарговымі творчымі пытаннямі і яны знойдуць месца ў тэзісах прамоўцаў і ў рашэннях з'езда.

Гэта не дробязі!

Вобразы і цені

Барыс БУР'ЯН

Чалавек едзе ў цягніку. За акном — родны краявід: калгасныя гоні, мачтавыя сосны... Раптам — арка. Негарэльская арка. І чалавек пачынае расказваць аб тым, што хвалюе яго, калі ён бачыць гэтую арку, на якой палымнеюць прарочыя словы: «Комунізм змяце ўсе граніцы».

Толькі вочы заплюшчу —
З Нясвіжа да Гродна
Шлях паходны
У песнях паходных звініць.
Гэта сталасць мая
Да хаціны сірочай
Несла волю,
Спакой,
Залаты умалот.
На Карпаты,
На Буг
З намі Верасень крочыў
І на плошчах спяваў,
Як Семнаццаты год...

З пачуццём вялікага грамадзянскага гонару паведамляе пасажыр з цягніка Мінск—Брэст:

Дзе ў мытні шпікі дэфензівы
Маякоўскага рэчы траслі,
Я без візы праеду, шчаслівы
Сын і творца шчаслівай зямлі.

Нас хвалююць радкі, у якіх з палітычным запалам і шчырым натхненнем услаўляюцца незабыўныя падзеі, што назаўсёды звітаваны з пагранічнай аркай у Негарэлым. Аднак, пазнаёміўшыся з добрымі страфамі, усхвалявана прачытаўшы асобныя радкі, мы не сустрэліся з непаўторным характарам, па-свойму здольным асэнсоўваць рэчаіснасць і па-свойму-ж гаварыць нават пра агульнавядомыя падзеі.

Нягледзячы на фармальныя адзнакі паэтычнай індывідуальнасці, у паэме «Негатычнай індывідуальнасці, у паэме «Негарэльская арка» няма погляду на з'явы і жыццё, які ўласцівы іменна А. Вялюгіну. Тое, што напісаў паэт, характарызуе совецкага чалавека. Але чалавек, якога мы бачым у паэме, пазбаўлены акрэсленага характару.

На нашу думку, лірычная паэма, накшталт «Негарэльскай аркі», павінна цэментавацца характарам лірычнага героя, ад імя якога вядзецца апавяданне.

Успомнім цудоўную паэму «Толькі ўперад» А. Куляшова. Лірычны герой яе— абагулены вобраз аднаго з тых, хто ў наш час галоўную службу нясе. І ў той-жа час гэта — зусім канкрэтны характар. Як і ў паэме А. Вялюгіна, у паэме «Толькі ўперад» герой выказвае свае адносіны да вялікіх падзей сучаснасці. Але нас прывабіў і ён сам, нам спадабаўся яго характар, мы шмат чаго ведаем аб ім і ведаем не па анкетных звестках, а з яго ўчынкаў, з яго пачуццяў і роздумаў.

Мы слухаем споведзь чалавека, на долю якому выпала страціць сваю каханую і жыць з параненым сэрцам, якое не можа забыцца на першае святое пачуццё. Параненае сэрца героя паэмы — гарачае сэрца. Яно шукае шчасця ў працы, у дзейнасці, у змаганні. «Трэба ўперад ісці, толькі ўперад ісці» — вось яго ідэал, суладны з ідэалам, у імя якога загінула ў барацьбе каханая. Адны пісьмы дзяўчыны засталіся герою, і яны

Б'юць мне ў сэрца,
штурхаюць у скронь,
Мне здавалася, я ўжо
даўно іх забыў,
А я першай любоўю
люблю, як любіў, —
І хмарынку бялявую
ў сіняве,
І касынку чырвоную
на галаве,
Комсамольскі значок:
сцяг і літары «КІМ»,
Комсамольскае сэрца
пад значком баявым.

Адчуўшы непахісную адданасць героя свайму жыццёваму ідэалу, чытач успрымае кожны ўчынак і кожнае слова свайго субяседніка, як праяўленне пэўнага характару. Характар гэты і вызначыў памеры і межы лірычнай споведзі — паэмы «Толькі ўперад». Такому чалавеку, як герой паэмы, не ўласціва шматслоўе, яму няма патрэбы гаварыць больш за тое, што ім было сказана.

А вось лірычнаму герою паэмы «Негарэльская арка» можна яшчэ ў дзесятках і нават сотнях радкоў гаварыць і пра тое, што ён бачыць за акном цягніка Мінск—Брэст, і як жылі раней у Заходняй Беларусі, і як жывуць цяпер, і ўспамінаць пра негра ў Алабаме, пра змагароў у Карэі, пра Маякоўскага і Антоніо Мачада... Характар героя не будзе больш выразным, бо паэт адвёў яму ролю сузіральніка і фіксатара з'яў. Калі-б лірычны герой А. Вялюгіна не толькі апавядаў, але і ўдзельнічаў у жыцці, спрачаўся-б з кім-небудзь, адстойваў-бы нешта, пераадольваў-бы нейкія перашкоды — **рабіў-бы** пэўныя ўчынкі, — справа іншая. Паступова мы ўявілі-б, што ён за чалавек, і слухалі-б не ўвогуле натхнёныя і змястоўныя радкі, а словы і думкі канкрэтнай асобы, канкрэтнага характару. Ды і палкоўнік, які мімаходам дапаўняе сказанае лірычным героем паэмы, мог-бы стаць цікавым вобразам. У лірычнай паэме дастаткова зусім нязначнага, на першы погляд, але бездакорна дакладнага мазка, каб характар «увогуле» ператварыўся ў канкрэтны характар жывога чалавека, каб цень стаў вобразам.

У паэме «Дом ля дарогі» А. Твардоўскі малюе вобраз свайго героя іменна такімі, амаль непрыкметнымі штрыхамі. Вось жанчына глядзіць услед натоўпу ваеннапалонных, жадаючы сярод іх сустрэць мужа:

И я не попрекну
Тебя, что под конвоем
Идёшь. И за войну,
Живой, не стал героем.
Откликнись — отзовусь,
Я здесь — твоя Анюта...

Аднак ёй толькі на хвілінку здалося, што гэта так. Яна — совецкая жанчына і добра ведае свайго мужа — совецкага чалавека.

Спроси, а он, пожалуй,
И мёртвый не простит,
Что здесь его искала...

Гэтага штрыха дастаткова, каб перад намі паўсталі ва ўсёй складанасці і велічы два чалавечыя характары. Няхай потым не будзе такіх дакладных рысаў, хай застануцца толькі больш агульныя словы, мы бачым ужо ў сваім уяўленні вобразы, акрэсленыя з той сціплай трапнасцю, якая і вымагаецца лірыкай і лірычнай паэмай у прыватнасці.

Характар лірычнага героя, яго духоўны склад і тэмперамент — вось што надае лірычнай паэме мастацкую закончанасць. Калі ёсць такі герой, дык пасля апошняга радка ў творы быццам чуеш: я ўсё сказаў! Калі няма, — чуеш нешта іншае: пастаўлена кропка ці клічнік, але можна гаварыць і далей. Бо тады адсутнічае патрэбны арганізуючы цэнтр, які ўплывае і на змест і на форму лірычнай паэмы. Паэма выглядае крохкім сховішчам усяго, што заўважыў паэт і паспеў занатаваць.

Нешта падобнае наглядаецца ў паэме «На новых прасторах» М. Лужаніна. Калі А. Вялюгін, пазіраючы з акна цягніка, рыфмаваў усе свае ўражанні, М. Лужанін, каб пачаць гэты свой твор, выйшаў з аўтамабіля і прайшоўся па палескіх гонях. Але сузіральнасць ёсць сузіральнасць. Яна хоць часамі і вядзе да частковых поспехаў, наносіць шкоду асноўнаму пафасу твора. У паэме «На новых прасторах» закранута літаральна ўсё, што магчыма закрануць пры размове аб пераўтварэнні прыроды.

Вось палешукі едуць на рынак у Пінск. Вяслуе на лодцы гаспадар, за рулём — гаспадыня.

І кожны човен, быццам дом,
Ці нават цэлая сядзіба:
Сакочуць куры з пявуном,
У кошыку трапеча рыба.

Насенне ў торбах,
Звязкі траў,
Прышчэпы дрэўцаў гатункових
І дробязь гаспадарскіх спраў,
На першы погляд неўжыткових.

Прыблізна ў такім духу напісана ўся паэма. Пералік бачанага суправаджаецца правільнымі, але зусім лішнімі каментарыямі, накшталт таго, што

Цяпер калішні паляшук
Плыве найшчаслівейшы ў свеце.
Вось зараз,
Тут,
маю душу
Пяці марэй абвеяў вецер.

З Палесся паэт пераносіць пагляд на Полаччыну і каментыруе агульнавядомыя звесткі пра будаўніцтва славутай электрастанцыі на возеры Дрысвяты:

Дружба народаў!
Так назваць
Яе рашылі аднадушна.
Павек ёй зззяць,
Павек стаяць,
Як наша дружба, непарушна.

Добра было-б, калі-б гэты каментарый, зусім правільны, набыў якасці не звычайнай рыфмаванай прамовы, а паэтычна неабходнага, патрэбнага, натуральнага выказвання пэўнага лірычнага героя.

Вялікая паэзія вымагае такіх слоў, калі чытач быццам нанава пазнае агульнавядомае. Паэма М. Лужаніна звялася да пераліку геаграфічных назваў, машын, розных прафесій і тэхнічных мерапрыемстваў. Чытач-жа чакаў сустрэць у творы вобраз жывога чалавека. Ды і паэт абяцаў нам сустрэчу з сапраўднымі жывымі вобразамі, калі пісаў, што варта злучыць безліч палескіх балот, рэк, азёр, і будзе такі прастор — не мора, хай сабе поўмора.

Дарма,
Што гэтага няма,
Няўжо-ж пісаць і марыць рана?
Ці-ж мала самых смелых мар
Падтрымліваў разлік Дзяржплана!

Зразумела, пасля такіх мясцін у паэме павінна з'явіцца карціна будучыні. Яна і з'яўляецца на пэўны час. Аднак зноў толькі ў пераліку таго, што будзе некалі ў палескім краю. Чалавека няма. Пералік рэчаў, падзей, тэхнічных прылад, як лес, схаваў ад чытача тых, хто марыць і хто дбае аб будучым. Ніводнага штрыха не знайшоў М. Лужанін, каб сагрэць апісанне самазвалаў, рыдлёвак, «газікаў», экскаватараў чалавечым цяплом. Адносіны да рэчаў перадаюцца паэтам прыблізна ў наступным духу:

З чым параўнаць яго (экскаватар. —Б. Б.) маглі-б?

Дом? Кепска.
Вежа? Зноў нялоўка.
Я знаю мудры лінатып,
Станкі для круглае шліфоўкі,
Станок, які па чарцяжу
Абточыць сам дэталь цяжкую, —
Аб іх я многа раскажу,
А тут міжволі запасуеш.

Паэт пасуе перад экскаватарам не на доўга: праз радок падрабязна апісваюцца сам экскаватар і яго работа. Затым ідуць дваццаць радкоў пра кранаўшчыка. Толькі іх амаль не прыкмячаеш, бо кранаўшчык падаецца паэтам, як прылада экскаватара. Не ратуюць ні «аблічча юнака надзвычай шчаснае», ні «мірг яго, як перадае загады крану», ні «радасна ўсмешка...». Акрамя тэхнікі і рэчаў, акрамя геаграфічнага агляду розных рэк стэпаў у паэме прысутнічае гісторыя. Грамадзянская вайна, Вялікая Айчынная вайна, нават Сцяпан Разін і Емяльян Пугачоў... Паэт, відаць, лічыў, што варта ўпамянуць аб выдатных падзеях мінулага і — узнікне перад чытачом усеабдымная перспектыва нашага будаўніцтва. Атрымалася інакш. Чытаеш паэму і не ведаеш, якія ідэйна-мастацкія намеры выклікалі ўсю гэту плынь тэхнічных, геаграфічных, гістарычных звестак, чым прадыктаваны неабходнасць эпізодаў, прысвечаных, напрыклад, бурлакам ці паплечнікам Сцяпана Разіна, навошта было пераносіцца з Палесся на возера Дрысвяты, потым на будаўніцтва Волга-Дона, далей — да Чорнага мора, дзе плаваюць караблі балгарскіх і румынскіх.

А ўсё таму, што М. Лужанін зачыніў дзверы перад чалавекам, не пусціў яго на старонкі паэмы ў якасці гаспадара твора, галоўнага вобраза, якому і павінны аддавацца ўвага і творчыя намаганні мастака. Дзе-ні-дзе прабіваліся парасткі, якія маглі набрацца сілы і вырасці ў мастацкі вобраз лірычнага героя, аднак аўтар пазбавіў іх жыватворчай вільгаці і экскаватарамі і «газікамі» закрыў ад іх сонца. Яны выглядаюць кволымі, гэтыя парасткі.

Так будзе!
І Палессе у нас
Адкрыецца багатым плёнам.
Я бачу гэты шчодры час
І веру, як у сцяг чырвоны.

. . . . . .

М. Лужанін паведаміў, што лірычны герой калісьці ваяваў у стэпе паміж Волгай і Донам, потым вярнуўся ў Мінск, пажыў у родным горадзе і зноў паехаў у стэп, каб там удзельнічаць у будаўніцтве Волга-Дона. Апавяданне пра такі шлях чалавека, магчыма, і склала-б сюжэт паэмы, калі-б «я» не гублялася ў гушчары рыфмаваных радкоў пра тэхніку, геаграфію і гісторыю. Лірычны герой, пазбаўлены акрэсленага характару, вядома, не ўплывае ні на ідэйна-мастацкае гучанне твора, ні на яго арганізацыю.

Лірычная паэма прыцягвае ўвагу нашых паэтаў усё больш і больш. Прыклад А. Куляшова сведчыць, што плённыя вынікі чакаюць аўтара тады, калі лірычная паэма застаецца перш-на-перш лірычнай, г. зн. раскрывае своеасаблівы свет пачуццяў і думак пэўнага чалавека. Зразумела, вобраз героя лірычнай паэмы адрозніваецца ад вобразаў эпічных твораў. Тут і характар будуецца з дапамогай надзвычай сціплых сродкаў.

Гэта цудоўна ўмеў рабіць Владзімір Маякоўскі.

Я видел
места,
где инжир с айвой
росли без труда
у рта моего, —
к таким
относящься
иначе,
Но землю,
которую
завоевал
и полуживую
выняньчил,
где с пулей встань,
с винтовкой ложись,
где каплей
льешься с массами,
с такою
землёю
пойдёшь
на жизнь,
на труд,
на праздник
и на смерть.

Сэнс гэтых набатных радкоў, здавалася-б, вельмі знаёмы, а чытаеш і — слова лірычнага героя паэта ўваходзіць у твае думу, каб яшчэ і яшчэ раз сцвердзіць вялікае пачуццё, якое мы выказваем звычайнымі словамі: я люблю Радзіму, бо за яе шчасце і свабоду было праліта многа крыві, і я сам гатоў ісці з роднай краінай «на жыццё, на працу, на свята і на смерць».

Паэзія — гэта адкрыццё новага. І герою лірычнай паэмы мала толькі паўтараць «я» ды «я», прышпільваючы да «я» агульныя, усім вядомыя і ўжо скарыстаныя разважанні. Тады ніякага вобраза лірычнага героя не ўзнікае. І наадварот, варта надаць гэтаму «я» здольнасць па-свойму бачыць жыццё і глыбока асэнсоўваць навакольнае, «я» набывае рысы характару. Паэма робіцца жывой біяграфіяй цікавага чалавека, набывае ідэйна-мастацкую цэльнасць, вызначаную характарам героя, і знаёміць чытача з тым, што можа ўзброіць і ўзбагаціць духоўна, а не толькі паведаміць аб чым-небудзь. Чалавек — герой паэзіі. Яму і ў лірычнай паэме—першынство!

У партарганізацыі пісьменнікаў

Сход партарганізацыі ССП БССР абмеркаваў пытанне аб ходзе падрыхтоўкі да трэцяга з'езда пісьменнікаў Беларусі.

Дакладчык П. Кавалёў і комуністы ў сваіх выступленнях адзначалі, што падрыхтоўка да з'езда, асабліва ў галіне творчых пытанняў, разгорнута пакуль што недастаткова. Не актывізавалі сваёй дзейнасці секцыі прозы, паэзіі і драматургіі. Многія старэйшыя пісьменнікі да гэтага часу не выступілі ў друку па творчых пытаннях. Партыйнае бюро і прэзідыум ССП БССР не арганізавалі перад'здаўскіх сустрэч пісьменнікаў з чытачамі, масавых літаратурных вечароў.

— Мінулы пісьменніцкі з'езд, — адзначыў І. Мележ, — прайшоў без удзелу чытачоў. Нам трэба паклапаціцца, каб на гэтым з'ездзе прысутнічалі чытачы, для якіх мы пішам свае творы.

— Наш з'езд толькі тады вырашыць сваю задачу, — сказаў І. Шамякін, — калі ў перад'здаўскай дыскусіі і на самім з'ездзе асноўная ўвага будзе аддадзена творчым пытанням, пытанням далейшага павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню беларускай літаратуры. — Прамоўца крытыкаваў часопісы «Полымя» і «Беларусь» за тое, што яны, па сутнасці, стаяць у баку ад падрыхтоўкі да з'езда.

І. Грамовіч, А. Зарыцкі, К. Кірэенка, М. Калачынскі, якія прымалі ўдзел у з'ездах пісьменнікаў брацкіх рэспублік, падзяліліся сваімі ўражаннямі, расказалі аб вопыце падрыхтоўкі і правядзення з'ездаў.

Па абмеркаванаму пытанню сход прыняў пастанову.

Нашы пажаданні

Віцебскае абласное літаб'еднанне налічвае больш за дваццаць маладых пісьменнікаў. Гэта — людзі розных прафесій і спецыяльнасцей, розных узростаў. Многія з іх зрабілі першыя ўдалыя творчыя заяўкі.

Наша аб'еднанне падрыхтавала зборнік «Над Дзвіной», які адасланы ў Саюз пісьменнікаў БССР для канчатковага рэдагавання. Зборнік мяркуецца выдаць у Мінску. У яго ўключаны творы 18 аўтараў: апавяданні, нарысы, вершы, байкі.

Бюро аб'еднання намеціла правесці рад заняткаў па тэорыі літаратуры. Аднак узнікае пытанне, а хто будзе чытаць лекцыі на занятках? У нас, у Віцебску, ёсць выкладчыкі літаратуры. Але было-б куды карысней праслухаць не проста акадэмічныя лекцыі, а лекцыі-гутаркі сталых пісьменнікаў аб пісьменніцкім майстэрстве.

Мы самі часта не можам аказаць творчую дапамогу свайму таварышу. Нядаўна член аб'еднання Л. Студзёны закончыў працу над п'есай «Агням гарэць ярка». Многія таварышы знаёмы з ёю. Чыталі яе і ў тэатры імя Якуба Коласа. Ухвалілі, вядома, з некаторымі заўвагамі. Тэатр выказаў свае думкі і вярнуў п'есу аўтару. А што далей?

За апошні час маладыя і пачынаючыя паэты і празаікі Н. Гвоздзікаў, П. Клепік, Ф. Троіцкі, П. Мядзведзеў і інш. напісалі рад новых твораў. Аб'еднанне рэкамендавала рэдакцыі абласной газеты надрукаваць іх. Аднак творы пачынаючых ляжаць у аддзеле культуры і быту. На працягу трох год у газеце «Віцебскі рабочы» не друкуюцца літаратурныя старонкі. Толькі зрэдку, у святочных нумарах, змяшчаецца які-небудзь верш «на тэму дня».

Такія адносіны газеты да творчасці пачынаючых пісьменнікаў недаравальныя. Рэдакцыя павінна дапамагаць літаратурнай моладзі ў яе творчым росце, прыцягваць да ўдзелу ў газеце.

Сур'ёзным недахопам у рабоце літаратурнай моладзі нашай вобласці з'яўляецца адсутнасць твораў аб вялікіх пераўтварэннях, што адбываюцца на Віцебшчыне і ў рэспубліцы. Тут павінна сказаць сваё слова зноў-такі абласная газета.

Цяпер, мусіць, ні адзін з пачынаючых не мае цеснай, хоць-бы пісьмовай сувязі ні з адным ужо вядомым пісьменнікам. А Максім Горкі перапісваўся з цэлай арміяй пачынаючых. Шэфства старэйшых таварышаў над маладымі — гэта адзін з відаў практычнай і вельмі дзейснай творчай дапамогі моладзі.

Хацелася-б, каб па ўсіх гэтых пытаннях на з'ездзе пісьменнікаў былі прыняты канкрэтныя рашэнні.

Н. МАКАЕЎ,
старшыня Віцебскага абласнога літаратурнага аб'еднання.

Новая літаратуразнаўчая праца

Камісія па крытыцы абмеркавала даследаванне Міхася Клімковіча «Аб жыватворчым уплыве рускай літаратуры на беларускую літаратуру». Аўтар паказвае, што на працягу ўсёй сваёй гісторыі беларуская літаратура была цесна звязана з прагрэсіўнай рускай літаратурай, і гэта спрыяла яе дэмакратызацыі і творчаму росту. Крытыкам выкарыстаны багаты фактычны матэрыял.

П. Глебка, Ул. Карпаў, М. Садковіч, А. Кучар, Я. Шарахоўскі, А. Есакоў раілі аўтару папрацаваць над кампазіцыяй кнігі, ярчэй паказаць літаратурны ўплыў як узаемны працэс, больш уважліва адрэдагаваць кнігу.

Камісія па крытыцы рэкамендавала працу да друку і прасіла выдавецтва БССР выпусціць яе ў свет у гэтым годзе. Нельга не адзначыць, што гэтая цікавая праца поўгода праляжала ў камісіі па крытыцы і толькі цяпер яе здагадаліся абмеркаваць.

З БЛАКНОТА ПІСЬМЕННІКА

Малдаўскія сустрэчы

Дзень адкрыцця першага з'езда совецкіх пісьменнікаў Малдавіі, 24 жніўня, у якім мне давялося ўдзельнічаць у якасці госця, супаў са знамянальнай для малдаўскага народа датай — 10-годдзем з дня вызвалення сталіцы Малдаўскай ССР — горада Кішынёва ад фашысцкіх захопнікаў. Гэты дзень быў радасным і вялікім святам для працоўных рэспублікі.

Мінула ўсяго толькі дзесяць год, але як многа зроблена за гэты час! Не верыцца, што Кішынёў увесь ляжаў у руінах. Цяпер гэта прыгожы, добраўпарадкаваны горад, з цудоўным чатырохкіламетравым праспектам імя Леніна, паабапал якога выстраіліся новыя архітэктурныя ансамблі. Увесь горад патанае ў зеляніне, а з самалёта сталіца наогул выглядае суцэльным садам. За пасляваенныя гады ў Кішынёве пабудавана жылых дамоў у восем разоў больш, чым за апошнія 23 гады акупацыі Бесарабіі баярскай Румыніяй. Занава, па сутнасці, створана прамысловасць сталіцы. Цяпер у Кішынёве налічваецца 119 прамысловых прадпрыемстваў. У параўнанні з першым пасляваенным годам прамысловасць вырасла ў 14 разоў.

Незабыўнае ўражанне пакінулі ў нас прыгожыя краявіды Малдавіі, яе зялёныя ўзгоркі і даліны, яе бясконцыя лясныя масівы—кодры, яе багатая ўрадлівая зямля з незлічонай колькасцю вінаграднікаў, бахчаў і садоў, яе кукурузныя палеткі. Надоўга застануцца для нас цёплым успамінам сустрэчы з працавітымі і гасціннымі малдаўскімі вінаградарамі, з прадстаўнікамі вясковай інтэлігенцыі — настаўнікамі, аграномамі МТС, механізатарамі.

Поспехі працоўных рэспублікі, дасягнутыя ў першыя дзесяць пасляваенных гадоў, даюць усе падставы верыць, што малдаўскі народ з дапамогай вялікага рускага народа, у брацкім супрацоўніцтве з усімі народамі нашай Радзімы дасягне яшчэ большага росквіту сваёй гаспадаркі і культуры, што ён будзе ісці поплеч з усімі совецкімі народамі да высокай і светлай мэты — да комунізма.

* * *

Малдаўская совецкая літаратура — адна з самых маладых сярод брацкіх літаратур Совецкага Саюза. Найбольш плённы перыяд у яе развіцці пачаўся, па сутнасці, толькі пасля Вялікай Айчыннай вайны. У гэтыя гады адчувальна актывізавалася творчая дзейнасць старэйшых пісьменнікаў Малдавіі—Ем. Букава, А. Лупана, Б. Істру, Я. Куткавецкага, Л. Барскага, Л. Карняну, уліліся ў літаратуру новыя маладыя таленты — Ф. Панамар, С. Шляху, Г. Менюк, І. Друцэ, А. Козмеску і іншыя.

Развіццё літаратуры Малдавіі адбывалася ў цеснай сувязі з агульным ростам усёй совецкай літаратуры пад плённым уплывам брацкіх і асабліва рускай літаратуры. Цяпер малдаўская паэзія і проза ўпэўнена ідуць па шляху свайго росту. Лепшыя творы сталі шырока вядомы не толькі малдаўскаму, але і ўсесаюзнаму чытачу, і нават за межамі Совецкага Саюза. Перакладзены на рускую мову і выдадзены ў Маскве зборнікі паэзіі Андрэя Лупана, Багдана Істру, Емельяна Букава, празаічныя творы Самсона Шляху, Якава Куткавецкага і многіх іншых празаікаў і паэтаў.

Калі ў першыя пасляваенныя гады ў малдаўскай літаратуры значна пераважала паэзія — і па колькасці, і па рознастайнасці тэматыкі, і па мастацкіх якасцях, — дык цяпер прыкметна вырасла і проза. Створаны першыя малдаўскія совецкія раманы — «Растуць паверхі» Ем. Букава, «Абуджэнне» А. Ліпкана, «Маяк Кетросы» Ф. Панамара, «Кодры» І. Чабану, з'явіліся аповесці «Зоры» і «Агонь» Я. Куткавецкага, «Таварыш Ваня» С. Шляху, «Гара Вінаградная» і «Уздым» А. Козмеску, «Бужаране» Л. Барскага, выйшлі зборнікі апавяданняў І. Друцэ, С. Шляху, А. Лупана. Значна пашырылася тэматыка творчасці малдаўскіх пісьменнікаў, яна стала больш актуальнай, наблізілася да задач сённяшняга дня. Не пакідаючы ў забыцці такія тэмы, як паказ жыцця народа пад прыгнётам румына-баярскіх акупантаў, як адлюстраванне тэмы барацьбы супраць фашызма ў гады Айчыннай вайны, і проза, і паэзія ў апошнія гады ўсё больш шырока адлюстроўваюць жыццё калгаснага сяла, вялікія пераўтварэнні, якія адбываюцца ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы, фарміраванне і развіццё рабочага класа і інтэлігенцыі ў рэспубліцы.

На першым з'ездзе пісьменнікаў Малдавіі былі ўзняты і абмеркаваны многія пытанні, якія хвалявалі і празаікаў і паэтаў, у першую чаргу пытанні, звязаныя з далейшым ростам літаратуры, з павышэннем яе мастацкай якасці, ідэйнай значымасці. Многа яшчэ недахопаў мае маладая малдаўская літаратура і перш за ўсё гэта — недастаткова высокая мастацкая якасць многіх яе твораў, спрошчанасць і схематызм вобразаў, неглыбокае адлюстраванне поўнакроўнага, багатага на падзеі сучаснага жыцця. Прыкладам такога схематычнага адлюстравання складанейшых з'яў жыцця з'явіўся, па агульнай думцы на з'ездзе, раман маладога празаіка Н. Муратава «Кодры» — аб партызанскай барацьбе малдаўскага народа ў дні Айчыннай вайны.

Прадметам шырокага абмеркавання на з'ездзе стаў і той факт, што ў малдаўскай літаратуры дагэтуль недапушчальна адстаюць многія важнейшыя жанры — драматургія, дзіцячая літаратура і, асабліва, крытыка.

Лепшыя творы малдаўскай паэзіі і прозы сведчаць аб тым, што пісьменнікі Малдавіі знаходзяцца на правільным шляху і ўпэўнена ідуць да сваёй творчай спеласці. Хочацца ад душы пажадаць поспеху малдаўскім сябрам.

* * *

Дарэчы, хочацца выказаць адно меркаванне, якое, на нашу думку, мае прынцыповае значэнне: дрэнна, непрадумана планіруюцца нашым Дзяржаўным выдавецтвам БССР пераклады лепшых твораў брацкіх літаратур на беларускую мову.

Толькі гэтым можна растлумачыць факт, што беларускі чытач дагэтуль незнаёмы ні з адным лепшым творам — ні ў паэзіі, ні ў прозе — малдаўскай літаратуры, не знаёмы з цудоўным малдаўскім фальклорам. І такая незацікаўленасць існуе не толькі ў адносінах да малдаўскай літаратуры. Беларускі чытач не мае перакладаў на родную мову лепшых здабыткаў літаратуры сваіх заходніх суседзяў — літоўскіх, латышскіх, эстонскіх пісьменнікаў, не мае перакладаў з многіх брацкіх літаратур.

А як узбагаціла-б нашу літаратуру такое ўзаемнае азнаямленне, як быў-бы ўдзячны за такое знаёмства наш беларускі чытач!

Усевалад КРАЎЧАНКА.

Папаўненне карцінай галерэі

Дзяржаўная карцінная галерэя БССР набыла рад твораў выдатных майстроў выяўленчага мастацтва. Сярод іх — бронзавая мадэль вядомага статуарнага партрэта Петра І, створаная скульптарам-перасоўнікам М. Антакольскім у 1872 годзе.

Значную цікавасць уяўляе конная бронзавая статуэтка «Бедуін на кані» работы Е. Лансерэ, чыгунная статуэтка «Коннік» І. Клодта.

У ліку набытых твораў — бронзавая галава Петра І, выкананая Коло — вучаніцай П. Фальконе, аўтара помніка Петру І ў Ленінградзе. Бронзавы адліў мае самастойную цікавасць, дзякуючы высокаму партрэтнаму майстэрству скульптара.

Арыгінальныя работы з фарфару: «Мао Цзэ-дун з дзецьмі» А. Бржэзіцкай, «Малахітавая шкатулка» О. Багданавай, «Калінін у Мічурына» Н. Слабадзінскай. Асаблівую ўвагу прыцягваюць творы: «Від Смольнага манастыра» А. Багалюбава, «Бабулька» Ф. Броннікава і «Бярозавы гай» А. Куінджы, варыянт вядомага пейзажа, які знаходзіцца ў экспазіцыі Трэцьякоўскай галерэі.

Набытыя творы з'яўляюцца каштоўным папаўненнем аддзела твораў рускіх мастакоў галерэі.

П. ПЯТРОЎ.

Падрыхтоўка да агляду

У калектывах мастацкай самадзейнасці г. Слуцка разгарнулася падрыхтоўка да рэспубліканскага агляду. Пры гарадскім Доме культуры створаны і працуюць харавы, драматычны і танцавальны калектывы, гурток мастацкага чытання і рад іншых. Мастацкім калектывам Дома культуры за жнівень дадзены канцэрты ў калгасах, для жыхароў горада, а таксама ў раённым цэнтры Любань.

А. ДУБІЦКІ.

Літстаронкі ў раённай газеце

У пачатку гэтага года пры лунінецкай раённай газеце «Авангард» арганізаваўся літаратурны гурток, у склад якога ўвайшлі пачынаючыя пісьменнікі раёна. Гуртком падрыхтаваны да друку і змешчаны ў раённай газеце дзве літаратурныя старонкі. У газеце рэгулярна друкуюць свае творы пачынаючыя паэты С. Сямёнаў, В. Каратышэўскі, Ів. Муравейка і іншыя. Рэдакцыя публікуе таксама агляды твораў маладых пісьменнікаў.

Ул. ДЗІКЕВІЧ.

Пісьмо ў рэдакцыю

Аб музычных інструментах і нотах

У Гродна і вобласці павялічваецца колькасць людзей, якія займаюцца музыкай. Для гэтага патрэбны інструменты. Яны ёсць у клубах, дамах культуры, у многіх хатах-чытальнях, школах і спецыяльных навучальных установах. Але, як ні дзіўна, ні ў Гродна, ні ў адным з іншых гарадоў і раённых цэнтраў вобласці няма ніводнай майстэрні па рамонту інструментаў. Каб адрамантаваць баян або скрыпку, даводзіцца ездзіць у Мінск, Маладзечна ці ў Брэст.

Гандлёвая сетка таксама дрэнна працуе. У кніжных магазінах няма новай музычнай літаратуры, хоць на базах вельмі многа патрэбных і цікавых нот, якія ляжаць на працягу некалькіх год. Сельскія калектывы мастацкай самадзейнасці, асабліва цяпер, калі яны заняты падрыхтоўкай да рэспубліканскага агляду, маюць вострую патрэбу ў музычнай літаратуры.

І. ДАНЦОЎ.

г. Гродна.

Без рэжысёрскага нагляду

На спектаклях Гродзенскага тэатра

Сталы нагляд над жыццём акцёра ў спектаклі К. С. Станіслаўскі лічыў важнейшым абавязкам рэжысёра. Надзвычай сур'ёзныя, на думку вялікага майстра сцэны, і абавязкі рэжысёра ў выхаванні акцёраў, асабліва маладога пакалення. Ён павінен нястомна развіваць у іх творчае ўяўленне, «уменне бачыць, наглядаць, вывучаць жыццё вокам, вухам, сэрцам і розумам мастака» і ўзнаўляць гэтае жыццё на сцэне. Рэжысёр-педагог тактоўна ахоўвае моладзь ад штампаў і рамесніцкіх звычак.

Але горшае становішча тых акцёраў, якія дзейнічаюць у спектаклях, дзе няма яснай творчай думкі рэжысуры, «беспрытульных» у сэнсе мастацкага нагляду і кантролю. У іх выканаўцы элементарна «разведзены» па мізансцэнах. Кожны акцёр дзейнічае стыхійна, толькі паводле інтуіцыі і праяўляе ўласны прыватны вопыт або паўтарае свае звыклыя штампы. Дарэмна шукаць у такіх сцэнічных творах ясную «звышзадачу», свежыя інтанацыі, сапраўдную ансамблевасць.

Такія думкі ўзнікаюць пасля прагляду трох спектакляў па творах заходнееўрапейскай класікі («Марыя Тюдор», «Валенсіянская ўдава» і «Еўгенія Грандэ») у выкананні гродзенскага калектыва. Гэты тэатр мінулы сезон працаваў амаль без сталай рэжысуры. А. Міронскі з-за хваробы не закончыў пастаноўкі драмы В. Гюго (спектакль здавалі асістэнты) і на працягу года быў пазбаўлены магчымасці наглядаць за гэтым сцэнічным творам. А. Струнін аказаўся па сваіх творчых і этычных прынцыпах чалавекам выпадковым у калектыве. Паспешліва закончыўшы работу па інсцэніроўцы «Еўгеніі Грандэ» і камедыі Лопе дэ Вега, Струнін пакінуў тэатр.

Галоўны недахоп гэтых пастановак — адсутнасць ансамблевасці, што, аднак, не замінае асобным артыстам станоўча праявіць сваё майстэрства і здольнасці. У першую чаргу гэта датычыць М. Кавязінай — артысткі, якая найбольш глыбока і арганічна ўжылася з думкамі і пачуццямі гераінь — Марыі Тюдор і асабліва Грандэ.

Пра Грандэ мы ў рамане чытаем, што «гэта жанчына, смешная па вонкаваму выгляду, была надзелена высокай душой, яна заўсёды адчувала сябе... глыбока прыніжанай залежнасцю і заняволеннем, супраць якога пакорлівасць не дазваляла паўставаць...». Грандэ Кавязінай—сапраўдная пакутніца, чалавек з чулым і шчырым сэрцам. Але яна зусім бязвольная, бездапаможная ў жыцці. Маўклівая пакорлівасць няўхільнаму жорсткаму лёсу—вынік поўнай бяспраўнасці гэтай жанчыны. У сям'і тырана і скнары Фелікса Грандэ — маці яго дачкі самая безабаронная істота. Ад гора і бяды яна ўся высахла, і твар яе стаў жоўтым. Псіхалогія нявольніцы адчуваецца ва ўсіх паводзінах старой, у яе нязграбных, марудных рухах, у баязні парушыць традыцыю цярплівасці да тыраніі мужа. У вачах жанчыны часам свеціцца жывы агеньчык, але ён хутка гасне, і перад намі зноў вялая, абыякавая да ўсяго навакольнага жыцця істота, якая ўрэшце змарнела, знясіленая цяжкімі драматычнымі перажываннямі. Артыстка дасягае жыццёвай праўды сцэнічнага вобраза арганічнасцю сваіх паводзін у спектаклі.

Багацце тэмпераменту і творчага ўяўлення Кавязінай можна заўважыць і ў вобразе Марыі Тюдор. Марыя — жанчына ўладарная і разам з тым ілжывая, бязлітасная ў задавальненні сваіх жаданняў і дзівацтваў. У псіхалагічным партрэце гераіні вырысоўваюцца смешная ганарлівасць, страшэнная разбэшчанасць і грубы цынізм чалавека дэспатычнага, з выпусташаным сэрцам і абыякавымі, бескаляровымі вачыма. Марыя — тонка сатканы сатырычны партрэт. Артыстка злоснай іроніяй і знішчальнай крытыкай гераіні пераконвае, што такім людзям неўласцівы сапраўдныя шчырыя пачуцці. Шкада толькі, што з прычыны адсутнасці рэжысёрскага кантролю ў гэтым вобразе выразная ідэйная накіраванасць часам губляецца ў недаравальнай мітусні, якая зацямняе вобраз і зніжае яго выкрывальны пафас.

Ёсць трапныя знаходкі і ў артыста В. Шрамчанкі — выканаўцы ролі Фелікса Грандэ. Фелікс у спектаклі — гранічна завостраны тып чалавека, для якога золата з'яўляецца ўвасабленнем найвышэйшага шчасця і радасці, канчатковай мэтай усіх яго мар і імкненняў. У імя павелічэння багацтваў Фелікс Грандэ занядбаў сям'ю, бацькоўскія пачуцці, грамадзянскае сумленне. Усе адносіны паміж людзьмі, іх мараль і чалавечую годнасць Фелікс ацэньвае выключна з пункту погляду сваёй матэрыяльнай выгады.

В. Шрамчанка ўбачыў асноўную тэму вобраза ў сцверджанні Фелікса, што «ўсё жыццё чалавечае — здзелка і спекуляцыя...». Усе элементы сцэнічнай выразнасці артыст накіраваў на ўвасабленне гэтай ідэі. Жыццё Шрамчанкі ў ролі натуральнае і арганічнае. Адчуваецца здольнасць артыста «вокам, вухам, сэрцам і розумам мастака» знайсці найбольш тыповае і важнае ў вобразе.

Ёсць у спектаклях асобныя ўдалыя сцэны, трапныя дэталі мастацкага афармлення (асабліва ў рабоце Б. Малкіна над дэкарацыямі «Валенсіянскай удавы»). Цікавыя рысы прыкметны і ў некаторых іншых сцэнічных вобразах (Сімон Рэнар—Г. Глінаецкі, Джошуа — Я. Кімберг). Аднак дамінуючым у спектаклях застаецца стылявая невыразнасць, нівеліроўка жанравых асаблівасцей твораў і безуважнасць да эпохі, якая ў іх адлюстравана.

Найбольш рэзка гэтыя недахопы праявіліся ў акцёрскай ігры М. Шкурэнкі, які выступае ў цэнтральных ролях. Вобразы ў яго ўвасабленні — найбольш заштампаваныя, у адпаведнасці з амплуа героя-любоўніка. Розныя характары — буржуазнага выскачкі Шарля Грандэ, нахабнага фаварыта каралевы Марыі Фабіяні, шчыра закаханага ў таямнічую незнаёмую юнака Камілы—намаляваны безгустоўна. Яму ва ўсіх ролях аднолькава ўласцівы напышлівасць і псеўда-рамантычны пафас, прыгожая поза. Гэта асабліва недаравальна ў камедыі Лопе дэ Вега, які заўсёды іранізаваў над вонкавай вычварнасцю любоўных тырад, над штучнымі позамі і збітымі фразамі, што замянілі гарачыя парывы сэрца герояў і гераінь. Мяняюцца касцюмы і грымы, але падобнымі адзін на аднаго застаюцца вобразы, якія не выклікаюць ніякіх цікавых думак і глыбокіх эмоцый. Адчуваецца, што артыст, працуючы без рэжысёрскага кантролю, аддаў усю сваю энергію рамесніцкім спосабам уздзеяння на публіку. Выпадзенне з ансамбля аднаго з цэнтральных вобразаў разбурае мастацкую тканіну спектакляў, спрашчае канфлікты ў іх і пазбаўляе глыбокага сэнсу дасціпны і сакавіты дыялаг.

Неглыбока адчула асаблівасці стылю камедыі «Валенсіянская ўдава» таленавітая артыстка М. Астанкава. Акрыляючае пачуццё кахання, якое перамагае саслоўныя забабоны і робіць шчаслівымі юныя сэрцы, пададзена ў п'есе так, што патрабуе ад акцёра жывога тэмпераменту, чулай рэакцыі на кожны рух сэрца героя, багатага творчага ўяўлення, яркай фантазіі артыста. І разам з тым, Лопе дэ Вега перасцерагаў ад вонкавых праяў пачуцця: ён знаходзіў паэзію кахання не ў яго вонкавай форме, а ў глыбокім лірызме. У поўных юнацкага запалу і жыццерадаснасці камедыях іспанскага класіка адчуваецца голас эпохі, надзея на магчымасць перамогі высокіх душэўных парываў чалавека над неспрыяльнымі ўмовамі яго жыцця ў тагачасным грамадстве.

М. Астанкавай у вобразе ўдавы Леанарды нехапае адухоўленасці пачуцця, яркага тэмпераменту, уласцівых яе іспанскай гераіні. Няма ў вобразе маладога запалу і гарачага жыццелюбства. Сустрэчы з Камілам, якія ў творы напоўнены палымяным хвалюючым пачуццём, артыстка вядзе без належнай цеплыні, энергіі і вастрыні. Вобраз пазбаўлены іспанскага каларыту, у ім не адчуваецца нацыянальнага характару, «нораваў веку».

Аднастайнасць мастацкіх сродкаў уласціва вобразам Еўгеніі Грандэ і Джэн («Марыя Тюдор») у выкананні артысткі Е. Цвятковай. Няма выразна акрэсленых рыс натуры ў юнай прыгажуні Джэн і маладой пакутніцы Еўгеніі — дачкі Фелікса Грандэ. Артыстка шчырая і сардэчная, але гэтыя якасці амаль аднолькава праяўляюцца ў вобразе Олі Васільковай («Свеціць, ды не грэе») і гераінь заходнееўрапейскай класікі.

Гераіні заходнееўрапейскай класікі нівеліраваны Цвятковай, пазбаўлены нацыянальнай афарбоўкі і каларыту, адзнак эпохі.

Небяспека штампу праявілася ў здольнага маладога артыста Ю. Сідарава. Выхаванец рэалістычнай школы імя Шчэпкіна пры Малым тэатры, артыст з-за рэжысёрскай бескантрольнасці ў спектаклі «Марыя Тюдор» раптам пачаў «рваць страсць на кавалкі». У ролі чэканшчыка манет Гільберта асабістую драму героя Ю. Сідараў перадае празмерным фізічным напружаннем, а душэўны боль—істэрычным надрывам.

Рознастылёвасць ігры, абыякавасць да творчай манеры драматурга зніжаюць культуру спектакляў, спрашчаюць ідэі і канфлікты драматычных твораў.

Адсутнасць добрага густу і мастацкай самастойнасці асабліва адчуваецца ў спектаклях, пастаўленых А. Струніным. Рэжысёр, відаць, і не імкнуўся да ўласнага сцэнічнага прачытання вядомых класічных твораў, а абмежаваўся іх прымітыўнай мізансцэніроўкай. Ён не шукаў магчымасці раскрыць творчую прыроду акцёра, а задаволіўся тым, што кожны з іх прынёс у спектакль.

Асноўная ідэя «Марыі Тюдор» прагучала невыразна. На першым плане апынулася не палітычная ідэя выкрыцця манархіі, а любоўныя прыгоды каралевы Марыі з яе фаварытам і асабісты канфлікт Гільберта з разбэшчаным вяльможам Фабіяні.

Няма сапраўднага адчування эпохі, паэтычнасці, яркай камедыйнасці і ў спектаклі «Валенсіянская ўдава».

Схематычна, двума фарбамі — чорнай і белай — намалявана пераважная большасць герояў «Еўгеніі Грандэ».

Такія вынікі адсутнасці рэжысуры ў тэатры, адсутнасці творчага кантролю над спектаклямі.

М. КАМЕНСКІ.

У дапамогу гурткам мастацкай самадзейнасці

Алесь МАХНАЧ

Родны калгас

Аднаактовая п'еса

Кантора праўлення калгаса. Направа і налева — дзверы. Адны з іх — на выхад, а другія — у кабінет старшыні. На сцяне — гадзіннік, тэлефон.

Заходзіць Святлана. Яна ідзе да кабінета старшыні калгаса і стукае ў дзверы, але адтуль ніхто не адказвае.

Святлана (прыадчыніўшы дзверы). Няма яшчэ. (Зірнула на гадзіннік). Не! Чакаць старшыні не буду. Пасля зводку перадам. А цяпер пабягу аўтобус сустракаць. Магчыма, Лёша сягоння прыедзе! (Раскрывае запісную кніжку і штосьці там разглядае).

З чамаданам у руках заходзіць Аляксей, якога Святлана адразу не заўважае.

Аляксей (асцярожна паставіўшы чамадан ля парога). Прыгожая... прыгожая... Не выглядайся. Сама, як люстэрка...

Святлана (збянтэжана). Ох! Лёша?! Лёшанька!!! (Кідаецца насустрач). Добры дзень!

Аляксей. Дзень добры! Дзень добры! Ой! Добра, што я ўбачыў, як ты сюды зайшла... (Кідае позірк на дзверы кабінета старшыні калгаса).

Святлана. Там няма нікога...

Аляксей нечакана цалуе Святлану.

Святлана (злёгку адштурхоўвае ад сябе Аляксея). Ідзі!.. Каб ведала — не сказала-б, што ў канторы няма нікога...

Аляксей. А я для цябе вялікую радасць прывёз...

Святлана. Якую?

Аляксей. Ты нават ніколі не сніла і не думала...

Святлана. Ну, дык кажы хутчэй!

Аляксей. Адгадай!

Святлана. Ты мне сам усё раскажаш.

Аляксей. Раскажу. Толькі добра папрасі.

Святлана. Ты хочаш пахваліцца сваім дыпломам, што ты ўжо зоатэхнік?.. Нос пачынаеш драць угару...

Дзеючыя асобы:

Святлана — сакратар камітэта комсамольскай арганізацыі калгаса.

Зарэчны Аляксей — выпускнік сельскагаспадарчага тэхнікума, зоатэхнік.

Богуш — старшыня калгаса.

Рыгор — старшы пастух.

Аляксей. Памыляешся.

Святлана. А што-ж?

Аляксей. Я хачу сказаць, што мы ў горадзе будзем жыць...

Святлана (здзіўлена). Дзе?

Аляксей. У Мінску...

Святлана (не разумеючы). Як у Мінску? Хіба там ёсць сельскагаспадарчая акадэмія?

Аляксей. Ці толькі на адной акадэміі навука трымаецца? А інстытуты, універсітэт? Ты можа хвалюешся за кватэру? Дык мой дзядзька ў міністэрстве працуе...

Святлана. Ведаю. Ну і што?

Аляксей. Яго хутка перавядуць кудысьці ў другі горад працаваць...

Святлана. А пры чым тут мы з табою?

Аляксей. Нам толькі прыпісацца ў дзядзькі і ўсё — кватэра наша. Будзем разам... Я там дзе-небудзь уладжуся працаваць, а ты вучыся далей...

Святлана. П'яны ты ці што?

Аляксей. Зразумей! Дакуль-жа мне ўсё студэнтам быць. Табе ўжо каля дваццаці пяці год, а мне і таго больш... А праз пяць год, пакуль гэта я з табой акадэмію закончу... (Уздыхнуўшы). Дык, калі-ж мы разам будзем?.. Гады-ж праходзяць...

Святлана. А мяне табе не шкада? Я-ж цябе чакала, ты-ж чатыры гады суцяшаў у сваіх лістах: «Паедзем у акадэмію і скончым разам...». А цяпер?

Аляксей. Што з табою здарылася?

Святлана. А што з табою? (Цяжка ўздыхнуўшы). Ты мяне хочаш зрабіць вартаўніком, каб я кватэру пільнавала?

Аляксей. Што ты? Там-жа вучыцца можна: у педінстытут ідзі, ва універсітэт...

Святлана (адварочваецца ад Аляксея). Любы мой! Дзе ты? Прыдзі! Ты-ж не ведаеш, як мне цяжка, як балюча...

Аляксей (рэўніва стукнуўшы кулаком па стале). Дык вось яно што! Другога знайшла?! Можа прызнаешся, што за ён?

Святлана. Я свайго Лёшаньку чакаю... які быў такі добры... прыгожы... разумны...

Аляксей (ласкава). Я тут.

Святлана (глянуўшы на Аляксея). Не! Гэта не ты! Няўжо цябе больш няма?

Аляксей. Супакойся...

Святлана, стрымліваючы слёзы, кідаецца ў кабінет старшыні калгаса. Чуваць, як да канторы пад'ехала аўтамашына. Праз хвіліну заходзіць старшыня калгаса Богуш, а за ім, абапіраючыся на кій, — старшы пастух Рыгор.

Богуш (заўважыўшы Аляксея, радасна ўзняў руку). О! Бацюхны мае! Каго бачу?! Аляксей! Здароў!

Аляксей. Добры дзень, таварыш старшыня!

Рыгор (таксама вітаючыся за руку з Аляксеем). Ляксей! А бадай цябе качкі стапталі! Ледзь пазнаў. З прыездам цябе!

Аляксей. Дзякую... Дзякую...

Богуш. Малайчына, Аляксей! Чыталі мы ў газеце пра выпуск вашага сельскагаспадарчага тэхнікума. Зоатэхнікі, аграномы... Ну, а ты цяпер, што, у акадэмікі глядзіш?..

Рыгор (перабівае, хітравата трасучы пальцам). Пачакайце, таварыш старшыня, пачакайце! Дайшло да мяне, што наш Ляксей не адзін збіраецца ў гэтыя акадэмікі паступаць...

Богуш (смеючыся). Дык, відаць, вы, дзед, раніцою за жалодзежам хаваецеся, што ўсе калгасныя навіны ў вас, як на далоні.

Рыгор. Зямля чуткамі жыве. (Да Аляксея). Я табе скажу: Святлана — дзяўчына што трэба. Яна ўжо сёмы год пад маёй камандай даяркай працуе. Шкада такія рукі адпускаць. Але-ж як для акадэміі — калі ласка! І ты, Ляксей, там не лянуйся, на доктара ветэрынарнага хутчэй выбівайся. Тут я ўсю надзею на цябе маю. (Задумаўшыся). Ну, а калі ты далей пойдзеш вучыцца, аж у акадэмію, што-ж, няхай прысылаюць другога... Вучыцеся, некалі мяне падменіце. У мяне вось нешта рэўматызм, бадай яго трасца ўзяла, убіўся ў ногі і сядзіць... На курорт збіраюся...

Богуш (да Аляксея). Хутка тут Святлана будзе.

Аляксей. Яна тут... была...

Богуш. А дзе-ж яна зводку аб надоях малака паклала?

Аляксей (кінуўшы позірк на кабінет старшыні калгаса). Яна там...

Богуш. Зводка?

Аляксей. Не! Святлана... Вы яе не турбуйце... Ёй нездаровіцца...

Богуш. Што-ж з ёй такое?.. (Ідзе да дзвярэй свайго кабінета).

Аляксей. Зубы... Зубы ў яе баляць...

Рыгор (да Аляксея). Цыбулькай, цыбулькай дзяўчат трэба частаваць, а не цукеркі з шакаладамі ім прывозіць, тады і зубы, як часнок, будуць здаровыя.

Богуш (адчыніўшы дзверы). Што з табой, Святлана? (Пауза). Ну, пайшлі — у бальніцу паедзеш.

Выходзіць засмучоная Святлана. Яна бярэ са сваёй запісной кніжачкі зводку і перадае яе Богушу.

Святлана. Я не паеду... Гэта пройдзе...

Рыгор. Што пройдзе?

Святлана. Галава...

Рыгор (да Аляксея, з іроніяй). Чуеш, што баліць дзяўчыне? Як відаць, ты, хлопец, зубы нам загаварваеш.

Богуш (пераводзіць размову на другую тэму). Аляксей! Ты, напэўна, не чуў: наша-ж Ніна Дземідовіч замуж у суседні калгас выходзіць...

Аляксей (без цікавасці). Мне пісалі аб гэтым.

Богуш (разглядаючы зводку). Дык вось прыходзь сягоння вечарам у клуб на сход, паслухаеш. Будзем замест Ніны новага загадчыка жывёлагадоўлі выбіраць. Трэба будзе другога старшага пастуха прызначаць, бо нешта наш дзед занядужаў...

Рыгор (узрушана падыходзіць да Богуша). Пачакай, таварыш старшыня! Што такое? Дваццаць два гады працую на гэтай пасадзе, а тут «занядужаў», «другога прызначаць»! Выходзіць, я ў вас больш не работнік?

Богуш. Карацей кажучы, думаем вам адстаўку даць па старасці.

Рыгор. Не на таго бацькі дзіця нарваліся!

Богуш (паціснуўшы плячыма). Нічога не папішаш — вам ужо за семдзесят год.

Рыгор. Здымаеце — здымайце! Але заяўляю: да міністраў дайду!

Богуш. Ніхто вас сілаю ў гэтую адстаўку не тоніць. Мы толькі вам прапаноўваем...

Рыгор (перабівае). «Прапаноўваем», «прапаноўваем»! Дык і трэба прапаноўваць, як трэба. Вы-ж ведаеце, што я часова на курорты еду, а не назусім.

Богуш. Добра! А каму-б вы хацелі перадаць свае абавязкі, пакуль не станеце на ногі?

Рыгор. Тут хапу-лапу не робіцца. Трэба спачатку падшукаць каго і пагаварыць, ці справіцца ён з маёй работай. Тут трэба галава разумная... (Да Святланы). Праўда, сакратар комсамольскі?!

Святлана. Праўда...

Рыгор. Што праўда? Ты парадкам скажы...

Святлана. Ну... Каб галава была разумная.

Рыгор. А дзе-ж тая галава? Вось ты мне гэта скажы! Хто яна такая?

Святлана. Комсамольцы нашы.

Рыгор. Твае комсамольцы заявы пішуць. Хутка разляцяцца, як птушкі, хто ў Мінск, хто ў Пінск, а тут патрэбны вучоныя людзі. А нашы разлятаюцца ва ўсе бакі, а няма таго, каб каторы вярнуўся з іх сюды. Толькі адзін наш Ляксей трымае правільны курс...

Святлана. Пагаварыць з людзьмі трэба.

Рыгор. Каб я з табою пагаварыў, ты-б засталася сягоння?

Святлана. Трэба будзе — застануся!

Рыгор. Сама бачыш — трэба! І загадчык жывёлагадоўлі і часова на маё месца... (Пауза. З іранічным дакорам). Бачыш! Патрэбна? (З насмешкай). Ну, што? села?!

Святлана (устае). Толькі не села, а ўстаю! Вылучаю сама сябе на пасаду загадчыка жывёлагадоўлі. Прашу сягоння на сходзе абмеркаваць! (Садзіцца).

Аляксей (з дакорам накінуўся на дзеда Рыгора). Нядобра прымушаць чалавека! Яна можа вучыцца хоча далей, а вы?..

Святлана. Ніхто мяне не прымушае... Я сама хачу тут працаваць... І ты, Лёша, не думай, што я здольна кінуць свой родны калгас.

Аляксей. Святлана... Што ты! Ты не хочаш зразумець мяне...

Богуш (перабівае). Паслухай мяне, Аляксей, што я табе скажу! Вось ты пасля акадэміі прыедзеш да нас на працу і тады, напэўна, скажаш: давайце мне для працы на фермах комсамольцаў з сярэдняй адукацыяй... Святлану мы ведаем яшчэ змалку. Днём яна на ферме працавала, а вечарам вучылася. Сярэднюю школу сельскай моладзі скончыла. (Да Святланы). Баюся, каб ты пасля не крыўдавала на нас і на сябе.

(Працяг на 4-й стар.).

Слова сяброў

(Па старонках абласных газет РСФСР і Украіны)

Летняя гастролі беларускіх тэатраў у РСФСР і на Украіне цікавы запамінальнымі творчымі сустрэчамі з новым чулым і патрабавальным гледачом.

Божны спектакль, майстэрства акцёраў, рэжысуры і мастакоў знайшлі ўважлівую ацэнку тэатральнай крытыкі і грамадскасці на старонках друку.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балету ўпершыню наведаў Яраслаўль і Іванава. Оперныя і балетныя спектаклі ў гэтых гарадах таксама, як і канцэрты, звычайна праходзілі пры перапоўненай зале і карысталіся поспехам у мясцовых жыхароў.

Рэвізор-кантралёр Поўночнай чыгункі А. Сакалоў пісаў у газеце «Северный рабочий» (30 ліпеня): «За час сваіх гастролей Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балету заваяваў у яраслаўцаў вялікую папулярнасць. Тэатр заўсёды быў поўны. З поспехам ішлі спектаклі «Ціхі Дон», «Князь Ігар», «Фауст», «Кармэн», «Лебядзінае возера» і іншыя». У гэтым-жа нумары газеты ўдзельнікі абласной нарады ільнаводаў выказалі шчырую калгасную падзяку артыстам за добры канцэрт, які яны далі для майстроў высокіх ураджаяў.

Цёплы водгук атрымалі выступленні тэатра імя Якуба Коласа ў харкаўскіх газетах. У рэцэнзіях на спектаклі «Раскіданае гняздо», «Несцерка» і «Машэка» адзначалася ўдумлівая работа калектыва над творамі беларускай драматургіі.

«Класічны твор беларускай драматургіі («Раскіданае гняздо») па-новаму прачытаны тэатрам, ён праўдзіва апавядае аб мінулым з пазіцый сучаснасці», — піша В. Нікалаеў у газеце «Красное Знамя».

Абласныя газеты Нікалаева і Одэсы адзначылі добры мастацкі густ рэжысуры і акцёраў Рускага драматычнага тэатра БССР у сцэнічным увасабленні «Варвараў» М. Горкага і «Караля Ліра» Шэкспіра, драматычнай сатыры «Шакалы» Якабсона і «Порт-Артура» Сцепанава.

У артыкуле Л. Віхрава, які змешчаны ў газеце «Калининградская правда» (29 чэрвеня), дадзена станоўчая ацэнка гастролям у Калінінградзе Гродзенскага абласнога тэатра.

«Калінінградцы, — піша газета, — змаглі па-сапраўднаму ацаніць майстэрства, эмацыянальнасць, густ многіх гродзенскіх артыстаў. Безумоўна, станоўчай ацэнкі заслугоўвае шчыльная сувязь, якая была наладжана тэатрам з прадпрыемствамі і калгасамі вобласці. 35 тысяч гледачоў пабывалі на спектаклях Гродзенскага тэатра».

Разам з тым, былі выказаны крытычныя заўвагі і прэтэнзіі ў адрас беларускіх творчых калектываў.

У рэцэнзіі на оперу «Ціхі Дон» кампазітар Н. Грынскі (яраслаўскі «Северный рабочий»), адзначаючы імкненне тэатра як мага ярчэй данесці да слухачоў асноўную ідэю твора, разам з тым робіць трапныя заўвагі выканаўцам асобных партый. Ён лічыць, што ва ўдумліва ўвасобленым Л. Александроўскай вобразе Аксінні ёсць асобныя рысы, з якімі нельга пагадзіцца. Так, напрыклад, песню «Долинушка ты, долинушка, раздольице широкое!», у якой адчуваецца гора Аксінні па шчасліваму жыццю, па каханаму, артыстка чамусьці выконвае ў паскораным тэмпе, у выніку чаго не ствараецца поўнага ўяўлення аб душэўным стане гераіні, здымаецца адна з характэрных рыс вобраза.

Крытык выказаў нездавальненне вобразам Грыгорыя, бо саліст Н. Лазараў «не здолеў поўнасцю раскрыць псіхалогію свайго героя, змены, якія адбыліся ў яго свядомасці. Так, маска суму і задумёнасці не пакідае Грыгорыя на працягу ўсяго спектакля, што супярэчыць унутранаму развіццю вобраза».

Газета «Красное Знамя» звярнула ўвагу тэатра імя Якуба Коласа на наяўнасць недасканалых сцэн і вобразаў у спектаклях «Машэка» і «Несцерка».

Аб вобразе Ганны («Машэка») аўтар артыкула В. Дуброўскі піша: «Такім, як ён задуманы драматургам, вобраз Ганны, вобраз па-свойму моцны і своеасаблівы, таксама меў-бы права на існаванне, калі-б у канцы аўтар не надзяліў яго псіхалагічна непераканальнымі рысамі меладраматызма. Таму значная работа артысткі З. Канапелька пакідае дваістае ўражанне — у яе Ганне змешчаны нібы два вобразы. Спачатку гэта простая, задушэўная сялянская дзяўчына, якая сарамліва марыць аб княжаскіх багаццях і пашане (у існаванне такой дзяўчыны, з яе захапленнямі і заблуджэннямі, верыш), але ў канцы спектакля з'яўляецца другая Ганна — з распушчанымі валасамі, якая прагне смерці Машэкі. Гэта ўжо тэатральны персанаж. Такую супярэчлівасць трэба аднесці не за кошт здольнай артысткі З. Канапелька, а за кошт аўтара п'есы».

У рэцэнзіі таксама заўважана прыніжэнне вобраза Машэкі ў канцы п'есы меладраматычнай трактоўкай ролі Ганны, перагрузка некаторых сцэн (танцы ў другой карціне, пахавальны абрад і трызна ў чацвёртай дзеі), наўмысная тэатральнасць сцэны барацьбы з мядзведзем.

Кампазіцыйную расцягнутасць апошняга акта, перанасычанага музычнымі і абрадавымі сцэнамі, пэўную пасіўнасць сцэнічных вобразаў Юрася і Насці адзначаюць у сваёй рэцэнзіі на «Несцерку» І. Кав'яраў і В. Сергееў.

Адабраючы творчую дзейнасць Рэспубліканскага рускага тэатра, газета «Знамя коммунизма» ў рэдакцыйным артыкуле, аднак, заяўляе, што «Беларускі тэатр не ва ўсім задаволіў патрабаванні нашых гледачоў. Сур'ёзным прабелам у яго гастрольным рэпертуары аказалася тэма пасляваеннай совецкай рэчаіснасці... Тэатр не паказаў нам ніводнай п'есы сваіх беларускіх драматургаў. Як відаць, калектыў тэатра яшчэ мала працуе над праблемай поўнацэннага ўвасаблення вобраза совецкага чалавека — будаўніка комунізма».

У артыкуле аб спектаклі «Кароль Лір» выкладчык Нікалаеўскага педагагічнага інстытута В. Авадэнка робіць зусім слушны дакор рэжысуры за няўдалае скарачэнне тэкста ролі блазна, што мела адмоўны ўплыў на сцэнічны вобраз, створаны таленавітым артыстам М. Сокалам.

Недасканаласць сцэнічнага вобраза Лідзіі Паўлаўны ў «Варварах» падкрэсліў рэцэнзент А. Градзаеўскі («Знамя коммунизма»).

«Са зладжанага ансамбля спектакля, — гаворыць газета, — выпадае, як нам здаецца, вобраз Лідзіі Паўлаўны. Відаць, выканаўца — артыстка Г. Старкоўская і рэжысёр не аддалі належнай увагі гэтай ролі. Гэта-ж расчараваная ў жыцці жанчына па-свойму імкнецца да ідэалу, яна незадаволена тым, што «ўсюды прагныя, усюды нікчэмныя». Іменна ў яе вусны драматург укладае словы асуджэння Чэркуна і яму падобных, якія не толькі не змянілі жыцця, але і самі пацямнелі. Лідзія будзе шукаць сапраўднага чалавека. Знайсці яго можна толькі ў народзе. Усяго гэтага, на жаль, не перадала артыстка, якая іграе без неабходнай глыбіні».

З. Дзьяканаў у артыкуле аб «Порт-Артуры» («Знамя коммунизма») накіроўвае ўвагу рэжысуры на больш уважлівыя адносіны да тэксту драматургаў, бо няўдалыя скарачэнні адмоўна ўплываюць на сцэнічныя характарыстыкі. Гэта, у прыватнасці, адчуваецца ў вобразах Радзіёнава і жонкі Стэселя. Патрабуе ўдасканалення сцэнічны вобраз адмірала Макарава (артыст Г. Качаткоў). «...Яго Макараў занадта сухі. Перад намі, безумоўна, стратэг, чалавек вялікага розуму, дзяржаўны дзеяч, але няма ў ім той душэўнай велічы і прастаты, якасцей, за якія так любілі яго матросы».

Аб неабходнасці папаўнення рэпертуару Гродзенскага тэатра п'есамі совецкіх драматургаў указала калектыву газета «Калининградская правда».

Прынцыповыя, сяброўскія заўвагі, якія былі зроблены нашым калектывам у час гастролей у брацкіх рэспубліках, павінны быць улічаны ў іх далейшай рабоце.

Заключныя спектаклі Тэатра транспарту ў Мінску

Шостага верасня спектаклем «Маці сваіх дзяцей» заканчвае свае гастролі ў сталіцы Совецкай Беларусі Цэнтральны тэатр транспарту.

Сустрэча мінчан з маскоўскім калектывам — адна з найбольш радасных у летнім сезоне. Масквічы парадавалі беларускіх гледачоў смелымі пошукамі ў галіне рэпертуару, пастаноўкай арыгінальных змястоўных п'ес, якія рэдка ідуць на іншых сцэнах, або наогул пастаўлены ўпершыню («Маці сваіх дзяцей», «Крадзеж», «Віхры варожыя»), удалымі інсцэніроўкамі сучасных і класічных твораў («Хаджэнне па пакутах», «Да новага берага»), удумлівай майстэрскай рэжысурай, дасканалым акцёрскім мастацтвам.

У спектаклях Тэатра транспарту з выключным поспехам выступалі артысты Л. Скопіна, А. Краснапольскі, А. Палевой, П. Паўленка, А. Талбузін, П. Крылоў і іншыя, якія ярка паказалі сваю творчую індывідуальнасць, уменне бачыць жыццё ва ўсім багацці яго фарбаў і праяў.

Глыбінёй думкі, злітнасцю ўнутранага і вонкавага малюнкаў вобразаў асабліва запомніліся: Л. Скопіна — Ільза Лідум, А. Краснапольскі — Артур, А. Палевой — іспанскі свяшчэннік і многія іншыя. Створаныя імі сцэнічныя партрэты надоўга застануцца ў сэрцы гледача.

Апрача штодзённых спектакляў для мінчан у Акруговым Доме афіцэраў, тэатр сістэматычна запрашаў да сябе чыгуначнікаў, калгаснікаў, прадстаўнікоў сельскай інтэлігенцыі, а таксама паказваў свае пастаноўкі ў раённых цэнтрах вобласці і ў сельскай мясцовасці.

Калектыў сустрэўся з мінскімі і маладзечанскімі чыгуначнікамі, са школьнікамі сталіцы. Рабочыя соўгаса «Вішнёўка» прагледзелі спектакль «Да новага берага».

Спектаклі Цэнтральнага тэатра транспарту наведала каля 40 тысяч гледачоў.

Родны калгас

(Заканчэнне).

Святлана. Завошта?

Богуш. Што далей не вучылася.

Святлана. Адкуль вы ўзялі, што я вучыцца не буду?

Аляксей (незадаволена). Ведаем мы гэту вучобу — курсы свінарак з цёткай Зосяй скончыш і ўсё!

Святлана (горда). Не толькі курсы, і акадэмію сельскагаспадарчую! Завочна на зоатэхнічны факультэт пайду. (Да Аляксея іранічна). Але не кіну вучобу, няхай мне хоць асабняк у горадзе абяцаюць, не толькі кватэру!

Аляксей сядзіць у панурым настроі.

Богуш (задаволена). Акадэмію, кажаш, завочна? Добра!

Рыгор (да Святланы). Толькі глядзі, мая дачушка, каб не кідала нашу жывёлу, як вывучышся на вялікага чалавека.

Святлана. Дзеду! Мы ідзем да такога дня, калі ў нашай краіне ўсе людзі будуць мець вышэйшую адукацыю па сваёй спецыяльнасці. Толькі яшчэ сягоння ёсць такія, якія не паважаюць сваю спецыяльнасць.

Рыгор. Што-ж, дачушка, калі яно так, дык тады нам-бы больш такіх акадэмікаў, як ты. Кашу маслам не сапсуеш. Вучыся і працуй! Што якое, і я табе дапамагаць буду па навуковай лініі. А там, глядзі, і Ляксей да нас вучоным прыедзе.

Богуш (да Аляксея). Даруй мне! Ты, здаецца, нешта хацеў сказаць, а я цябе перабіў?

Аляксей (вінавата глянуў на Святлану, нібы просячы ў яе прабачэння). Я... я хацеў таксама сказаць, каб Святлана далей вучылася...

Святлана (цвёрда). Не думай, Лёша, я не тая, што словы на вецер кідае!

Рыгор. Старшыня, а хто мяне тут часова падменіць, як я на курорт паеду?

Богуш. Магчыма вы самі на сходзе падкажаце?

Святлана (падказваючы). Дзед! Вы з нашых комсамольцаў сабе кандыдатуру вылучайце...

Рыгор (да Святланы). «Кандыдатуру», «кандыдатуру»... Лёгка сказаць! Старшы пастух у цяперашнім калгасе — гэта не проста пастух з пугаю, як некаторыя думаюць, а доктар ветэрынарны! Вось хто!

Богуш. Правільна, дзед!

Рыгор (да Святланы). А то знойдуць мне кандыдатуру, якая трох свіней не падлічыць.

Богуш. Я думаю, нам Аляксей дапаможа. (Да Аляксея). Што-ж гэта ты, браток, сядзіш у нас госцем? Мы табе, як нашаму будучаму старшаму зоатэхніку, кадры жывёлаводаў падбіраем, а ты нешта зажурыўся? Можа каго-небудзь парэкамендуеш нам часова на дзедава месца?

Святлана (з іроніяй). Вы яго не чапайце. Бачыце, чалавеку нездаровіцца — лячыцца трэба...

Аляксей (абражаны). Не хвалюйся, Святлана! Не такі я хворы, як табе здалося! Усё гэта пройдзе... У мяне ёсць кандыдатура!..

Богуш. Калі ласка, давай!

Аляксей. Неабходна комсамольца прызначыць...

Богуш. Каго думаеш?

Аляксей. Зарэчнага!..

Рыгор. Цішку?

Богуш. Ды што ты, хлопцу пайшоў пятнаццаты год!

Аляксей. Ды не Цішку, а зоатэхніка!..

Богуш (здзіўлена, але з радасцю). Цябе?!

Рыгор. Ляксея Зарэчнага?

Аляксей. Так, мяне! Прызнаюся... Сягоння раніцою ў мяне былі іншыя планы.

Святлана (з радасцю). Ой, Лёшанька!..

Рыгор (з іроніяй). Гэта табе так галава баліць? Расхадзілася!

Аляксей. ...А паглядзеў, што такія людзі, як я, патрэбны больш за ўсё тут, у калгасе. І я прашу, каб праўленне калгаса скарыстала мяне па маёй спецыяльнасці — зоатэхнікам.

Рыгор. Ляксейка! (Паціскае яму руку). Малайчына!

Аляксей. А каб не шукаць кандыдатуру, пабуду і на пасадзе старшага пастуха, пакуль вы свой рэўматызм лячыць будзеце...

Богуш (задаволена). Не чакаў я такой развязкі. Хаця вельмі хацеў, каб вось так яно было.

Святлана (у захапленні). Ой! Лёшанька! Які ты... (Схамянуўшыся). Ох! (Мяняе тон). І вучыцца будзем?

Аляксей. Будзем разам...

Рыгор (спахапіўшыся). Што мы сабе думаем? Чаго маўчым? Гэтакага чалавека трэба хутчэй на працу залічыць.

Богуш. Можна смела спадзявацца, што калгаснікі сягоння на сходзе падтрымаюць кандыдатуры Аляксея і Святланы.

Тэлефонны званок.

Богуш (зняўшы трубку, слухае). Я... Добры дзень!.. Добра, пад'едзем! (Вешае трубку. Да Рыгора). Што-ж, дзед, яшчэ пад'едзем і на свінагадоўчыя фермы. (Да Святланы і Аляксея, жартуючы). Можа і вас да бальніцы падвезці? Якраз па дарозе.

Святлана. Ды што вы, мы і хварэць не збіраліся. (Глянуўшы на Аляксея). Праўда, толькі Лёшу крыху дрэнна было... ды цяпер усё добра... Паправіўся...

Богуш (выходзячы, да Аляксея). Ну, Аляксей, глядзі! Калі будзеш у маладосці так хварэць, дык нам ад цябе дабра не чакаць...

Богуш і Рыгор выходзяць.

Аляксей (вінавата). Даруй мне за ўсё... За маё глупства... І дазволь мне шчыра падзякаваць табе за тваё добрае сэрца...

Святлана (з пачуццём радасці абдымае Аляксея). Лёшанька мой! Вось цяпер гэта ты! Ты прыехаў!

ЗАСЛОНА

У Міністэрстве культуры БССР

ШЫРЭЙ ПРАПАГАНДАВАЦЬ НАВУКОВА-АТЭІСТЫЧНЫЯ ВЕДЫ

Галоўнае ўпраўленне культасветустаноў і Цэнтральнае лекцыйнае бюро склікалі нараду дырэктараў абласных лекцыйных бюро, на якой былі абмеркаваны пытанні аб прапагандзе навукова-атэістычных і сельскагаспадарчых ведаў.

Дырэктар Брэсцкага абласнога лекцыйнага бюро тав. Кудзелін расказаў аб рабоце, якая праводзіцца сярод насельніцтва па прапагандзе навукова-атэістычных ведаў. У раёнах вобласці прачытаны лекцыі на тэмы: «Навука і рэлігія», «Аб паходжанні жыцця на зямлі», «Рэакцыйная сутнасць рэлігіі», «Будова сусвету», «Радыё і тэлебачанне» і г. д. Апраўдала сябе такое мерапрыемства, як правядзенне вечароў пытанняў і адказаў на прыродазнаўча-навуковыя тэмы. Раённыя лектарскія групы і аб'еднанні сельскіх лектараў вобласці рыхтуюцца цяпер да правядзення цыклу лекцый на навукова-атэістычныя тэмы. Аднак трэба сказаць, што ў вобласці ўсё яшчэ мала чытаецца лекцый на гэтыя тэмы.

Аб прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў гаварыў дырэктар Гродзенскага абласнога лекцыйнага бюро тав. Каплан. У бягучым годзе падрыхтавана сем лекцый. Значна ажывіла работу сельскагаспадарчая секцыя, у якой прымае ўдзел больш 30 спецыялістаў.

Тав. Каплан звярнуў увагу на тое, што лектары Цэнтральнага лекцыйнага бюро, выязджаючы ў камандзіроўкі, чытаюць лекцыі толькі ў раённых цэнтрах і зусім не выязджаюць у калгасы і МТС. У вобласці вялікі попыт на навукова-атэістычную літаратуру, але яе ў раённых кнігарнях няма, як няма і ў Мінску. Неабходна сістэматычна наладжваць інструкцыйна-метадычныя лекцыі, асабліва для аб'еднанняў сельскіх лектараў. Гэта значна павысіць якасць многіх лекцый, з якімі выступае наша сельская інтэлігенцыя.

— Палепшылася прапаганда атэістычных ведаў у Рагачоўскім, Васілевіцкім, Лоеўскім і Чачэрскім раёнах, — гаворыць дырэктар Гомельскага абласнога лекцыйнага бюро тав. Ласіца. — Значную дапамогу аказалі семінары кіраўнікоў раённых лектарскіх груп і інструкцыйна-метадычныя даклады для сельскіх лектараў. Добра наладзілі лекцыйную прапаганду Бабіцкае сельскае аб'еднанне Васілевіцкага раёна, Азеранскае — Рагачоўскага.

Дрэнна кіруюць работай раённых лектарскіх груп і сельскіх аб'еднанняў лектараў Акцябрскі, Добрушскі, Церахоўскі, Веткаўскі раённыя аддзелы культуры. Створаныя секцыі не працуюць. За другі квартал не абмеркавана ніводнага даклада і лекцыі.

Дырэктар Маладзечанскага абласнога лекцыйнага бюро тав. Вінакурава расказала аб тым, што ў Ільянскім раёне слаба праводзіцца навукова-атэістычная прапаганда. Лекцыі не наладжваюцца. Справа дайшла да таго, што ў дні царкоўных свят гандлюючыя арганізацыі раёна наладжваюць буфеты і г. д. Сельскія ўстановы культуры ў такія дні па невядомых прычынах зачынены.

Аб становішчы з прапагандай навукова-атэістычных ведаў у рэспубліцы гаварыла намеснік дырэктара Цэнтральнага лекцыйнага бюро тав. Лівенштэйн. Яна звярнула ўвагу на тое, што асобныя кіраўнікі лекцыйных бюро нядобрасумленна ставяцца да складання звестак, дасылаючы неправераныя, завышаныя лічбы і факты. Гэта стала сістэмай у рабоце дырэктара Віцебскага абласнога лекцыйнага бюро тав. Антанішына.

На нарадзе таксама выступілі тав. Лабаценка — лектар ЦК КПБ і тав. Кукушкін — начальнік Галоўнага ўпраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР.

Калгасны клуб

Вясной гэтага года ў калгасе імя Панамарэнкі Ленінскага раёна пабудаваны новы клуб. Першы канцэрт быў паказаны ў ім у дні першамайскіх свят. За лета ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці выступалі перад калгаснікамі многа разоў. Кіруе калектывам комсамолка Галіна Вайтовіч. У перыяд уборкі ўраджаю было дадзена тры канцэрты. У рэпертуары хора — песні совецкіх кампазітараў, беларускія і рускія народныя песні. Драматычны гурток, які ўзначальвае сакратар комсамольскай арганізацыі Кузьма Буневіч, нядаўна паказаў п'есы «Даходнае месца» і «Прапанова». Пастаяннымі ўдзельнікамі самадзейнасці з'яўляюцца маладыя калгасніцы Анастасія Шэўчык, Еўдакія Цішкевіч, Марыя Сергіевіч і іншыя. Калектыў рыхтуецца да раённага агляду мастацкай самадзейнасці, які адбудзецца ў канцы верасня.

Вялікая работа ў клубе праводзіцца па прапагандзе навукова-атэістычных ведаў. Нядаўна тут прачытаны лекцыі: «Соцыялізм і рэлігія», «За здаровы быт», а таксама даклад аб міжнародным становішчы.

Ул. ЯФІМОВІЧ.

Літаратурная хроніка

НАРАДА ПАЭТАЎ-ПЕСЕННІКАЎ

30 жніўня адбылася нарада паэтаў-песеннікаў, скліканая прэзідыумам ССП БССР. Былі заслуханы кароткія інфармацыі паэтаў аб рабоце над песеннымі тэкстамі. Усе прысутныя паведамілі, што ў бліжэйшы час яны дадуць кампазітарам па аднаму, а некаторыя і па два вершы, спецыяльна напісаныя як тэксты песень.

Гэтыя тэксты ў канцы верасня будуць абмеркаваны на паэтычнай секцыі.

Удзельнікі нарады К. Кірэенка, А. Вялюгін, Э. Агняцвет, А. Бялевіч, М. Калачынскі, А. Бачыла і іншыя ў сваіх выступленнях падкрэслілі, што да справы набыцця новых тэкстаў Галоўнае ўпраўленне па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР паставілася фармальна. У апошні час яно зусім перастала заказваць паэтам песенныя тэксты. Больш таго, ва Упраўленні ўстанавілася няправільная практыка заказаў, пры якой прыняты тэкст песні аплачваецца толькі тады, калі зацвярджаецца музыка. У выніку атрымліваецца, што ацэнка працы паэтаў поўнасцю залежыць ад творчай удачы ці няўдачы кампазітара. Гэтая практыка сведчыць аб перастрахоўцы, што мае месца ў рабоце Галоўнага ўпраўлення па справах мастацтва, якое не жадае паважаць свае заказы і браць на сябе адказнасць за набыццё тэкстаў.

У мінулым годзе права заказваць тэксты паэтам мела Галоўнае ўпраўленне радыёінфармацыі. Цяпер-жа гэтае права чамусьці страціла сілу.

Было адзначана, што паэты і кампазітары яшчэ рэдка збіраюцца на сумесныя пасяджэнні для абмеркавання творчых пытанняў.

НА ВЕНГЕРСКАЙ МОВЕ

Творы беларускіх пісьменнікаў вядомы далёка за межамі нашай рэспублікі. Папулярнасцю карыстаюцца яны і ў краінах народнай дэмакратыі.

Паводле дадзеных Рэспубліканскага Таварыства культурнай сувязі з заграніцай, у розных выдавецтвах Венгерскай Народнай Рэспублікі за апошнія сем год апублікавана 106 твораў нашых паэтаў і празаікаў і беларускіх народных казак і песень.

Венгерскі чытач пазнаёміўся з многімі вершамі народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. У прыватнасці, на венгерскую мову перакладзены вершы Я. Купалы «А хто там ідзе?», «Я не паэта», «Арлянятам», «Лён», «Сыны», «Беларускім партызанам» і іншыя; вершы Я. Коласа «Асадзі назад», «Дуб», «Комсамольцам», «Шчаслівая хвіліна» і інш.

Сярод апублікаваных твораў—«Бацька», «Балада аб чатырох заложніках», «Комуністы», «Комсамольскі білет», «Слова да Аб'еднаных Нацый» А. Куляшова; урыўкі з паэмы «Хлеб», «Зварот музыканта», «Маці» і іншыя вершы П. Броўкі; «Балада пра партызана Дубягу», «Новаселле» М. Танка. Перакладзены паасобныя вершы В. Таўлая, В. Віткі, А. Вялюгіна, П. Прыходзькі.

З празаічных твораў надрукаваны аповесць А. Кулакоўскага «Гартаванне» і апавяданне І. Шамякіна «Маленькая парыжанка».

АБМЕРКАВАННЕ НОВАЙ ПАЭМЫ

На сумесным пасяджэнні секцыі паэзіі і дзіцячай літаратуры быў абмеркаваны новы варыянт паэмы Эдзі Агняцвет «Будзем сябраваць».

Важнасць і цікавасць тэмы адзначыў М. Клімковіч. Паэма пабудавана на матэрыяле сучаснага жыцця школьнага калектыва. Тэма гераічнай барацьбы партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны, вобраз Рымы Шэршнёвай арганічна ўваходзяць у сюжэт паэмы. Гэты раздзел — лепшы ў паэме. Канфлікт, на якім пабудавана паэма, жыццёвы. Аднак ён не разгорнуты ў дастатковай ступені і занадта хутка здымаецца.

М. Клімковіч указвае на асобныя недахопы паэмы — няўдалыя дэталі, адсутнасць у некаторых выпадках дастатковай псіхалагічнай матывіроўкі ўчынкаў герояў, недапрацаванасць паасобных вобразаў. Разам з тым ён адзначае і рад паэтычных знаходак у паэме.

Новы варыянт паэмы лепшы за той, які змешчаны ў часопісе, і з'яўляецца, на думку прамоўцы, удачай аўтара.

А. Якімовіч, А. Кучар, А. Вялюгін, А. Есакоў, П. Прыходзька, К. Кірэенка гаварылі, што паэма прынясе карысць юнаму чытачу і настаўнікам. Дапрацоўка паэмы павінна пайсці па лініі псіхалагічнага паглыблення яе, удакладнення сюжэта, узмацнення прадметнасці вобразаў, неабходнай у творы для дзяцей.

Спартыўныя навіны

Сусветны рэкорд Міхаіла Крываносава

Некалькі дзён таму назад у сталіцу Швейцарыі—Берн з'ехаліся мацнейшыя лёгкаатлеты Еўропы. Яны спаборнічалі па бегу, скачках і кіданню. Гэтыя спаборніцтвы закончыліся выдатным поспехам совецкіх спартсменаў. Яны занялі першае камандзнае месца, значна апярэдзіўшы каманду Англіі. Дастаткова сказаць, што совецкія спартсмены набралі 221 ачко, а англічане — 91,5.

Спартсмены нашай Радзімы заваявалі 20 залатых, 11 сярэбраных і 10 бронзавых медаляў.

У саставе зборнай каманды Совецкага Саюза выступала чатыры беларускія майстры спорту, і ўсе занялі прызавыя месцы.

У спартыўнай хадзе на дзесяць кіламетраў за першае месца доўга змагаліся чэхаславак Долежал і беларускі майстар Ягораў. Больш вопытны чэх закончыў дыстанцыю першым. Ён атрымаў залаты медаль чэмпіёна. Ягораў заняў другое месца і ўзнагароджаны сярэбраным медалем.

Бліскучага выніку дабілася мінчанка Марыя Іткіна. Яна стала чэмпіёнкай Еўропы ў забегу на 200 метраў і ўзнагароджана залатым медалем пераможцы. Другі залаты медаль Іткіна атрымала за перамогу ў эстафетным бегу 4 па 100 метраў, у якім першае месца заняла каманда Совецкага Саюза.

Да гэтага першынства Еўропы на ўсіх міжнародных спаборніцтвах ў бегу на 400 метраў з бар'ерамі ў апошнія гады пераможцам выходзіў рэкардсмен свету ленінградзец Юрый Літуеў. Звычайна другім заканчваў дыстанцыю беларускі майстар спорту Анатолій Юлін. Здавалася, што і на першынстве Еўропы паўторыцца гэтая карціна. Спачатку наперад вырваўся рэкардсмен свету. Ушчыльную за ім бег Анатолій Юлін. Вось бегуны набліжаюцца да фінішу. І тут велізарным намаганнем волі наперад выходзіць беларускі майстар спорту. Анатолій Юлін устанавіў новы беларускі рэкорд, прабегшы 400 метраў з бар'ерамі за 50,5 секунды. Ён заваяваў званне чэмпіёна Еўропы і ганаровы залаты медаль.

Ва ўпартай барацьбе разыгрывалася першынство па кіданню молата. У ім удзельнічалі сусветны рэкардсмен нарвежац Страндлі, алімпійскі чэмпіён венгр Чэрмак, рэкардсмен Совецкага Саюза мінчанін Міхаіл Крываносаў і яшчэ рад мацнейшых кідальнікаў Еўропы.

У пачатку спаборніцтва Крываносаў выступаў няўдала. Ён дабіўся выніку усяго толькі 58 метраў 78 сантыметраў. Страндлі кінуў молат на 61 метр 7 сантыметраў, Чэрмак — на 59 метраў 72 сантыметры.

Але вось пачынаюцца фінальныя спаборніцтвы. У іх бліскуча праявіліся высокія валявыя якасці беларускага спартсмена. Кінуты ім молат праляцеў 63 метры 34 сантыметры. Гэта—новы выдатны сусветны рэкорд. Міхаіл Крываносаў у гэты дзень стаў уладальнікам трох новых рэкордаў па мятанню молата: сусветнага, усесаюзнага і беларускага. Ён узнагароджаны залатым медалем чэмпіёна Еўропы.

За выдатныя поспехі на міжнародных спаборніцтвах беларускія спартсмены Міхаіл Крываносаў і Анатолій Юлін атрымалі ганаровае званне заслужаных майстроў спорту.

Перамога юных барцоў Беларусі

Нядаўна ў Мінску адбыліся Усесаюзныя юнацкія спаборніцтвы па вольнай барацьбе. З васьмі юных барцоў Беларусі, якія ўдзельнічалі ў спаборніцтвах, шэсць занялі прызавыя месцы. Спартсмен лягчэйшай вагавай катэгорыі Шкляр у фінальнай сустрэчы за 24 секунды палажыў на лапаткі свайго праціўніка і заняў першае месца. Апрача яго, на першае месца выйшлі беларускія барцы Дайнека і Аксёнаў. Цікава тое, што пераможцамі сталі не толькі мінчанін Аксёнаў, але гамяльчанін Шкляр і бабруйчанін Дайнека.

Юныя беларускія барцы ўпэўнена занялі першае месца, апярэдзіўшы моцныя каманды Расійскай Федэрацыі, Грузіі і Масквы.

Ю. БАГУШЭВІЧ.

Новы сезон у тэатры імя Янкі Купалы

Сёння паказам прэм'еры «Чайка» Чэхава пачынае свой асенне-зімовы сезон Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Янкі Купалы.

Спектакль пастаўлены рэжысёрам Л. Мазалеўскай у мастацкім афармленні І. Пісарава.

Тэатр рыхтуе новыя спектаклі: «Зыкавы» Горкага (рэжысёр К. Саннікаў), «Пінскую шляхту» Дуніна-Марцінкевіча ў пастаноўцы таго-ж рэжысёра, «Ілгуна» Гальдоні (пастаноўка Д. Арлова).

Заканчэнне гастролей Гродзенскага тэатра

У Віцебску закончыліся гастролі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Творчы калектыў паказаў спектаклі «Гэта было ў Мінску», «Таня», «У бэзавым садзе», «Грэх ды бяда на каго не жыве», «Свепіць, ды не грэе» і іншыя.

Апрача спектакляў у абласным цэнтры, гродзенцы кожны дзень паказвалі свае пастаноўкі ў Оршы, Багушэўскім, Лепельскім, Сенненскім сельскіх раёнах.

(Наш кар.).

г. Віцебск.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Барыс ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 08433. Друкарня «Чырвоны друкар», Мінск, Рэволюцыйная, 12. 18